Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне
ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ

Навукова-творчы калектыў
«Беларуская школа – XXI стагоддзе»

# Гісторыя Беларусі
# Літаратура
# Сусветнае мастацтва

*Эксперыментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя*

Мінск
2014

# Уступнае слова

Распад савецкай імперыі ў самым пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя паставіў перад незалежнай Рэспублікай Беларусь надзённае пытанне правядзення першай уласнабеларускай рэформы адукацыі. Адным з найважнейшых напрамкаў гэтай рэформы было карэннае змяненне зместу гуманітарнай адукацыі, радыкальнае ўзмацненне ў ёй гуманістычнага, агульначалавечага і нацыянальнага зместу. Стварэнне Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра (БГАКЦ) і гуманітарнага ліцэя пры ім дазволіла згуртаваць педагогаў-практыкаў, якія былі гатовыя ўнесці істотны ўклад у рашэнне гэтай задачы. Так, ужо ўвесну 1992 года ў ліцэі адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Беларуская школа», у якой свае ідэі выказалі, як вышэйзгаданыя педагогі-практыкі, так і філосафы адукацыі, згуртаваныя ў часовым творчым калектыве пад кіраўніцтвам кандыдата філасофскіх навук Міхаіла Гусакоўскага. Гэтае супрацоўніцтва мела сваім плёнам сумесную распрацоўку «Канцэпцыі нацыянальнай школы» і «Мадэлі гуманітарнага ліцэя», прапанаваных Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці асновы адукацыйнай рэформы*. Педагогі БГАКЦ удзельнічалі ў распрацоўцы гімназічна-ліцэйскага кампанента гуманітарнай адукацыі для рэфармаванай 12-гадовай школы на замову вышэйзгаданага Міністэрства. На жаль, гэтыя і шмат якія іншыя напрацоўкі навукоўцаў і практыкаў былі пахаваныя падчас ажыц-

---

* Гэтыя матэрыялы можна знайсці ў свабодным доступе на сайце: www.nastaunik.info

цяўлення рэстаўрацыйнай рэформы 2008 г. пад кіраўніцтвам сумнавядомага акадэміка Анатоля Рубінава. Але ў Беларускім гуманітарным ліцэі, які функцыянуе цяпер як грамадская ініцыятыва, не сталі сячы па жывым, а прадоўжылі развіваць ідэі і пашыраць напрацоўкі, зробленыя ў 90-х – на пачатку 2000-х гадоў, і рэалізоўваць іх на практыцы. Сярод іншага, пастаянна дапрацоўваліся і перапрацоўваліся праграмы шэрагу дысцыплін, найперш гуманітарнага цыклу. Дапрацоўка праграм ішла ў рэчышчы стандартаў, прадугледжаных у заканадаўчых актах і нарматыўных дакументах краін Еўрапейскага Саюза. Асабліва шчыльныя кантакты Беларускага гуманітарнага ліцэя з польскімі партнёрамі дазволілі ў неабходнай меры ўлічыць станоўчы досвед апошніх адукацыйных рэформаў, ажыццёўленых некамуністычнымі ўрадамі гэтай краіны. Спадзяемся, што вынікі працы педагогаў і навукоўцаў Беларускага ліцэя і цяпер, і ў будучым зацікавяць творчых педагогаў, якія працуюць у іншых адукацыйных установах і, у той ці іншай меры, будуць імі выкарыстаныя.

*Аўтары,*
*чэрвень 2014 г.*

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Гісторыя Беларусі
## ад старажытнасці да канца XVIII ст.

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Склалі:
*Голубеў Валянцін,*
доктар гістарычных навук, прафесар
*Кітурка Ірына,*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

# УСТУП

## Гісторыя як дысцыпліна ў гуманітарным ліцэі

*Уводзіны.* Старажытнае лацінскае выслоўе гаворыць: «Historia est magistra vitae», што ў перакладзе азначае: «Гісторыя ёсць настаўніца жыцця». Сапраўды, гісторыя, асноўная задача якой заключаецца ў вывучэнні мінулага, на самой справе з'яўляецца не толькі «памяццю пра тое, што было». Гісторыя – гэта спадчына, падмурак і вопыт, абапіраючыся на якія, народы будуюць сваё далейшае жыццё.

Кожны народ павінен ведаць сваю гісторыю. Яна дазваляе чалавеку ўсвядоміць, што ён – не «рэч у сабе», а прадстаўнік пэўнага этнасу са сваімі традыцыямі, асаблівасцямі матэрыяльнай і духоўнай культуры. Менавіта гісторыя фарміруе чалавека як грамадзяніна і патрыёта, выхоўвае пачуццё прыналежнасці да сваёй краіны, адказнасці за яе будучае. Веданне і шанаванне мінулага свайго народа заўсёды з'яўлялася паказчыкам цывілізаванасці, а гістарычнае бяспамяцтва было прыкметай варварства і неразвітасці духа.

У свеце з'яўляецца натуральным, што кожны чалавек можа ацэньваць любую падзею так, як ён яе бачыць, з уласнага пункту гледжання. Так і ў гісторыі – кожны народ мае права ацэньваць тое, што было раней, з пункту гледжання карыснасці ці шкоднасці гэтых падзей для яго самага і яго дзяржавы.

На жаль, беларусы ў навейшы час не мелі магчымасці напісаць гісторыю Беларусі так, як яе бачаць самі бела-

русы. Доўгі час нават адсутнічала паняцце «беларуская гістарыяграфія гісторыі Беларусі». Пра нас пісалі нашыя суседзі –палякі, літоўцы, рускія, з якімі мы па тых ці іншых прычынах пэўны час жылі ў супольных дзяржавах. Пра Беларусь пісалі «савецкія гісторыкі», якія звычайна выконвалі сацыяльны заказ пануючай партыі і пры апісанні гістарычных падзей ужывалі прынцып «сацыялістычнага рэалізму», пры якім адкідалася ўсё, што не адпавядала палітычным устаноўкам камуністычнай партыі. Адмоўным для беларусаў было тое, што вышэйзгаданыя аўтары пісалі гісторыю Беларусі са свайго пункту гледжання, «пад сябе». А беларусы гэты варыянт сваёй гісторыі чыталі, бо іншага не было, вучылі на яго падставе сваіх дзяцей. Па-сутнасці, выхоўвалі нацыю на чужым бачанні сваёй гісторыі.

Спробы беларусаў выказаць уласную думку аб Беларусі, сваё бачанне ўласнай гісторыі на працягу мінула стагоддзя звычайна трактавалася як нацыяналізм. Напрыклад, для рускіх бачанне вайны 1654–1667 гг., якая ставіла на мэце далучэнне Беларусі да Маскоўскай дзяржавы, ёсць патрыятызм. А апісанне гэтых жа падзей з беларускага боку як агрэсіі з усходняга боку і паказ усенароднага супраціву маскоўскім захопнікам расцэньваецца як беларускі нацыяналізм, прычым нацыяналізм са знакам мінус. Зыходзячы з такой логікі беларусам нельга адзначаць перамогу над маскоўскім войскам у бітве пад Воршай у 1514 г., нельга пісаць пра адмоўныя наступствы для беларускай нацыі Брэсцкага міра 1918 г. і Рыжскага міра 1921 г., нельга пісаць пра злачынствы НКВД і інш.

Натуральна, што ні рускі, ні паляк, ні літовец, апісваючы які-небудзь спрэчны эпізод гісторыі ці падзею, не будзе ўсхваляць суперніка, прыніжаючы тым самым свайго супляменніка. На жаль, у гістарыяграфіі гісторыі Беларусі такія прыклады ёсць. Дасюль існуюць музеі Аляксандра Суворава, дасюль пішуцца працы, якія ўсхваляюць русіфікатара Міхаіла Мураўёва і кры-

тыкуюць за незалежніцкія погляды кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863–1864 гг. Канстанціна Каліноўскага ці лідэраў Беларускай Народнай Рэспублікі.

Вядома, што любую падзею можна апісаць так, каб яна не пашкодзіла нацыянальнаму гонару, а наадварот, паспрыяла змаганню за свабоду Бацькаўшчыны. Гэта разумеюць і менавіта так робяць у Еўропе і ва ўсім свеце. Беларусь таксама належыць да еўрапейскай цывілізацыі. Беларускі народ у сваім развіцці карыстаўся яе асноўнымі дасягненнямі і зрабіў свой уклад у яе спадчыну і гэта мы павінны ўлічваць у сваёй гісторыі і ў яе выкладанні.

У сярэдзіне – канцы 1990-х гадоў, падчас другой спробы беларусізацыі ўсіх галін жыцця, у Беларусі з’явіліся працы па гісторыі краіны, аўтары якіх апісваюць гісторыю Бацькаўшчыны з пункту гледжання беларусаў і імкнуцца дапамагчы чытачам разабрацца ў шматлікіх праблемах нашай мінуўшчыны. Штогод паляпшаюцца школьныя падручнікі, з якіх паступова зыходзіць камуністычная ідэалогія, а гістарычныя падзеі ўсё больш і больш пачынаюць асвятляцца з беларускага нацыянальнага пункту гледжання.

Разам з тым пасля ўзмацнення інтэграцыйных працэсаў з Расійскай Федэрацыяй пачала адбывацца пэўная «карэктыроўка» ў асвятленні некаторых гістарычных падзей. У гісторыкаў, якія забяспечваюць «абгрунтаванне» думак, выказаных прадстаўнікамі ўлады, ізноў пачаў пераважаць «усходні» вектар палітыкі разам з прапагандай неабходнасці так званай «саюзнай дзяржавы», абяленнем злачынстваў камуністычнага рэжыму і тлумачэннем іх «гістарычнай неабходнасці».

І калі гісторыю нацыі ў шырокім сэнсе слова яны перакрэсліць не ў стане, то існаванне і гістарычнае значэнне беларускай дзяржаўнасці ставяць пад сумненне пастаянна.

Праграма «Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.» прызначаная для навучэнцаў пачатковых курсаў

грамадскага Беларускага гуманітарнага ліцэя. Тут вылучаныя асноўныя моманты гісторыі Беларусі ад старажытнасці да падзелаў Рэчы Паспалітай, да ўключэння беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі. У канцы кожнай тэмы раскрываюцца асноўныя тэрміны, даецца храналогія падзей, вызначаюцца кантрольныя пытанні і заданні. Для арганізацыі самастойнай працы прапаноўваюцца тэмы рэфератаў і спіс літаратуры па тэме. Працай могуць карыстацца ўсе, хто цікавіцца гісторыяй роднага краю.

Курс гісторыі Беларусі ў грамадскім Беларускім гуманітарным ліцэі выкладаецца ў цесным спалучэнні з курсам сусветнай гісторыі, сусветнай мастацкай культуры, гісторыі Польшчы і гісторыі краін-суседзяў. Аўтары імкнуліся, каб гісторыю Беларусі навучэнцы маглі ўспрымаць у кантэксце еўрапейскай гісторыі і культуры.

## МЕТАДЫЧНАЯ НАТАТКА

Вучэбны курс «Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.», павінен забяспечыць фундаментальныя веды па гісторыі сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага жыцця беларускага народа.

Галоўная задача – дапамагчы навучэнцам Беларускага гуманітарнага ліцэя засвоіць веды па гісторыі Беларусі, навучыць іх свабодна арыентавацца ў гістарычных падзеях, паказаць, як яны ўплывалі на фарміраванне сацыяльнага грамадства на пэўным этапе, падкрэсліць значэнне гісторыі ў станаўленні чалавека-грамадзяніна, які заўсёды выхоўваецца на гераічных старонках з мінулага роднага краю.

Вырашэнне гэтых задач павінна дапамагчы навучэнцам арыентавацца ў складаным працэсе зараджэння і станаўлення беларусаў як самастойнай нацыі, утварэння незалежнай беларускай дзяржавы.

У працэсе вывучэння курса плануецца выкарыстаць веды, набытыя навучэнцамі на папярэднім этапе навучання.

У выніку вывучэння курса»Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.», і выканання заданняў на прапанаваных падручніку тэмах навучэнцы павінны:

1) ведаць перыядызацыю гістарычных падзей на тэрыторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.;

2) ведаць асноўныя гістарычныя падзеі (у межах, вызначаных праграмай);

3) ведаць найбольш значных гістарычных асоб і дзеячаў культуры Беларусі;

4) раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі;

5) ведаць асноўныя этапы фарміравання беларускага этнасу ў розныя гістарычныя перыяды;

6) правільна арыентавацца ў найбольш складаных пытаннях гісторыі краіны;

7) усведамляць сутнасць сацыяльна-эканамічных і дзяржаўна-палітычных працэсаў;

8) уяўляць, якое значэнне мелі для ходу гістарычных падзей міжканфесійныя канфлікты (эпоха язычніцтва, замена язычніцтва хрысціянствам, увядзенне уніяцтва, супрацьстаянне каталіцтва і праваслаўя і г. д.);

9) вызначаць месца і ролю беларускіх зямель у геапалітычных працэсах у розныя гістарычныя перыяды;

10) ведаць асноўныя этапы станаўлення дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, абагульняць гістарычныя факты і фармуляваць на гэтай падставе высновы;

11) ведаць і канкрэтызаваць змест гістарычных паняццяў.

Структура зместу праграмы грунтуецца на вызначэнні і адборы галоўных паняццяў, ідэй, тэндэнцый, фактаў, дат, імён

і іншых элементаў гістарычных ведаў, накіравана на тое, каб раскрыць сутнасныя элементы развіцця эканамічных адносін і важнейшыя рысы ў Беларусі; дэмаграфічную характарыстыку і сацыяльную стратыфікацыю грамадства; асноўныя палітычныя падзеі і іх уплыў на дзяржаўна-прававую эвалюцыю Беларусі; канфесійнае і этнакультурнае развіццё; найкаштоўнейшыя здабыткі духоўнага жыцця народа.

Пасля засваення курса «Гісторыя Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII ст.» навучэнцы павінны атрымаць веды па асноўных напрамках гісторыі Беларусі адзначанага перыяду, атрымаюць навыкі працы з крыніцамі і даследаваннямі па гісторыі Беларусі, навучацца аналізаваць і супастаўляць высновы розных аўтараў, крытычна адносіцца да думак, выказаных у падручніках і іншай літаратуры, і рабіць уласныя заключэнні на аснове крытычнага аналізу прачытанага, авалодаюць ўменнямі параўноўваць гістарычныя факты, раскрываць паміж імі прычынна-выніковыя сувязі, тлумачыць гістарычныя паняцці, даваць характарыстыку дзейнасці гістарычных асоб і творчасці дзеячаў культуры, даваць пэўныя тэарэтычныя высновы.

На працягу курса навучэнцы атрымаюць мажлівасць навучыцца напісанню гістарычных эсэ і дакладаў, выкананню тэстаў, фармуляванню сваіх думак для выступленняў і інш.

Паказчыкамі ўзроўню падрыхтоўкі абітурыентаў будзе засваенне тэарэтычнага, фактлагічнага, храналагічнага, картаграфічнага кампанентаў вучэбных гістарычных ведаў.

Пры кантрольных праверках навучэнцы павінны паказаць веданне гістарычных фактаў, праявіць уменне аналізаваць вучэбны і дадатковы матэрыял, рабіць абагульненні і праяўляць самастойнасць мыслення.

# КАРОТКІ ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА КУРСА

## 1. Уводзіны ў гісторыю Беларусі

Гісторыя Беларусі як навука і навучальная дысцыпліна. Асаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа. Тэрыторыя і прыродныя ўмовы. Эвалюцыя назваў краю і насельнікаў. Перыядызацыя гісторыі Беларусі. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння айчыннай гісторыі. Гісторыя як памяць народа.

## 2. Першабытная эпоха на тэрыторыі Беларусі (100 –35 тыс. гадоў да н.э. –VIII ст. н.э.)

Засяленне тэрыторыі Беларусі чалавекам. Каменны век, яго перыядызацыя. Прыродна-кліматычныя умовы. Старажытныя стаянкі. Фізічны тып, прылады працы, зброя, асноўныя заняткі першых насельнікаў Беларусі. Неаліт. Узнікненне вытворчых формаў гаспадаркі. Крэмнездабыўчыя шахты. Эвалюцыя сацыяльнай арганізацыі. Рэлігійныя вераванні і абрады. Першабытнае мастацтва.

Насельніцтва Беларусі ў бронзавым і жалезным вяках. Асаблівасці бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі. Рассяленне індаеўрапейцаў. Гаспадарчыя заняткі. Жывёлагадоўля і земляробства. Выплаўка і апрацоўка металаў. Першапачатковы абмен. Бацькоўскі род.

Асаблівасці разлажэння першабытнага грамадства на беларускіх землях. Пачатак рассялення славян на тэрыторыі

Беларусі. Узаемаадносіны славян і балтаў. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Сельская абшчына. Тып паселішчаў. Разлажэнне першабытнаабшчынных адносін. Матэрыяльная і духоўная культура. Рэлігійныя вераванні. Побыт, звычаі, духоўная культура людзей у першабытным грамадстве. Фарміраванне этнічных супольнасцяў. Канцэпцыі этнагенезу беларусаў.

## 3. Раннефедальныя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях (IX – першая палова XIII стст.)

Характэрныя рысы і перыядызацыя феадальнага спосабу вытворчасці. Генезіс феадальных адносін і сельская гаспадарка Беларусі ў IX – пачатку XIII ст.

Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на беларускіх землях. Вытокі дзяржаўнасці Беларусі. Княжанні і княствы. Роля варагаў. Землі старажытнай Беларусі і Кіеўская Русь. Полацкае княства. Узаемаадносіны Полацка з Кіевам і Ноўгарадам. Рагвалод і Рагнеда. Падпарадкаванне Полацка Ўладзімірам. Аднаўленне полацкай дынастыі. Ваенна-палітычная дзейнасць Брачыслава і Ўсяслава. Бітва на Нямізе. Узнікненне Тураўскага княства. Княжанне ў Тураве Святаполка Уладзіміравіча. Асаблівасці адміністрацыйнага ладу Турава. Узаемаадносіны з Кіевам. Княствы беларускага Панямоння. Землі беларускага Падняпроўя, Пасожжа і Пабужжа ў складзе Смаленскага, Чарнігаўскага, Кіеўскага і Валынскага княстваў.

Феадальная раздробленасць. Перадумовы, прычыны і галоўныя рысы феадальнай раздробленасці. Пачатак драблення Полацкай зямлі і яе ўдзелы. Часовае узвышэнне Менска ў часы Глеба Ўсяслававіча. Барацьба полацкіх князёў з кіеўскімі і яе вынікі. Усобіцы ў Полацкай зямлі. Ускладненне знешнепалітычнага становішча Полацкага княства напрыкан-

цы XII – пачатку XIII стст. Самастойнасць Тураўскага княства. Юрый Яраслававіч. Феадальная раздробленасць Тураўскага княства. Удзелы Тураўскай зямлі.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Шматукладнасць гаспадаркі. Зараджэнне і станаўленне феадальных адносін. Феадальнае землеўладанне. Умовы развіцця і стан сельскай гаспадаркі. Сістэмы земляробства, прылады працы, ураджайнасць. Натуральная гаспадарка. Першыя беларускія гарады і іх функцыі ў грамадстве. Шляхі узнікненне гарадоў. Зараджэнне і станаўленне гарадского рамяства. Унутраны і знешні гандаль. Дагавор Смаленска, Полацка і Віцебска з Рыгай 1229 г. Сацыяльная структура грамадства. Катэгорыі сялянства, іх павіннасці і падаткі. Свабоднае гарадское насельніцтва. Фарміраванне і склад феадальнай вярхушкі грамадства. Духавенства.

Рэлігія і культура. Перадумовы хрысціянізацыі. Заснаванне полацкай і тураўскай епархій. Заснаванне манастыроў. Першыя беларускія святыя. Узаемаадносіны хрысціянства і паганства. Дваяверства. Вынікі і значэнне распаўсюджання хрысціянства. Культура народных нізоў. Вусная народная творчасць. Быліны. Пісьмовая культура. Беларускія сюжэты ў «Слове пра паход Ігаравы». Праблема полацкага летапісання. Царкоўная літаратура. Творчасць Кірылы Тураўскага. Агіяграфія. Школы дойлідства. Фрэскавыя роспісы. Дэкаратыўна-прыкладное і ювелірнае мастацтва.

## 4. Утварэнне і станаўленне Вялікага княства Літоўскага (другая палова XIII – XV стст.)

Перадумовы і прычыны ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. Асноўныя канцэпцыі утварэння Вялікага Княства Літоўскага. Першыя згадкі пра Літву ў крыніцах. Праблема лакалізацыі летапіснай Літвы. прычыны утварэння но-

вай дзяржавы. Унутраныя і знешнія фактары. Роля Верхняга Панямоння ў працэсе складвання ВКЛ. Цэнтралізатарская палітыка вялікіх князёў.

Міндоўг і яго палітыка. Войшалк. Барацьба з мангола-татарамі і Ордэнам. Стабілізацыя сітуацыі пры Віцені. Узмацненне ВКЛ пры Гедыміне і Альгердзе. Барацьба з крыжакамі. Давыд Гарадзенскі. Змаганне з мангола-татарамі. Бітва на Сініх Водах. Шляхі ўваходжання беларускіх зямель у ВКЛ.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у складзе ВКЛ. Эканамічны лад і сацыяльныя працэсы. Стан сельскай гаспадаркі. Формы феадальнага землеўладання. Катэгорыі, землекарыстанне і павіннасці сялян. Віды сельскіх паселішчаў і сялянскіх надзелаў. Сялянская абшчына. Гарады Беларусі ў XIV–XVI ст. Склад гарадскога насельніцтва. Рамёствы і гандаль. Князі і баяры. Шляхта і яе паходжанне.

Дзяржаўны лад і органы кіравання ў ВКЛ. Судовая сістэма. Сацыяльная структура грамадства ВКЛ.

Абвастрэнне ўнутраных супярэчнасцей у Вялікім Княстве Літоўскім у канцы XIV ст. Дынастычная барацьба пасля смерці Альгерда. Андрэй Полацкі. Перагаворы аб шлюбе Ягайлы з дачкой Дзмітрыя Данскога. Падрыхтоўка, заключэнне і змест Крэўскага пагаднення. Аугльназемскі прывілей 1387 г. і яго сутнасць. Пачатак распаўсюджання каталіцтва на беларускіх землях. Узмацненне палітычных супярэчнасцей паміж феадаламі каталіцкага і праваслаўнага веравызнання. Пазіцыя Вітаўта. Барацьба Вітаўта з Ягайлам. Востраўскае пагадненне. Унутраная і знешняя палітыка Вітаўта. Ліквідацыя удзелаў і ўмацаванне цэнтральнай улады. Абласныя прывілеі і іх значэнне. Бітва на Ворскле і яе вынікі. Пашырэнне агрэсіі Тэўтонскага ордэна ў Прыбалтыцы. Саюз ВКЛ з Польшчай. «Вялікая вайна». Разгром крыжакоў пад Грунвальдам. Гарадзельскі прывілей 1413 г. і яго значэнне. Палітыка Вітаўта ў дачыненні да праваслаўнай царквы. Грамадзянская вай-

на 30-х гг. XV ст. у Вялікім княстве Літоўскім. Свідрыгайла і Жыгімонт Кейстутавіч. Прывілеі 1432 і 1434 гг. праваслаўнай знаці. Бітва пад Вількамірам. Казімір Ягелончык і яго палітыка. Пачатак княжання Казіміра. Паўстанні ў Смаленску і Жамойці. Барацьба за аднаўленне адзінства дзяржавы.

Залагоджванне сацыяльных канфліктаў. Агульназемскі прывілей 1447 г. і яго значэнне. Пачатак юрыдычнага афармлення прыгоннага права. Судзебнік 1468 г. Рэлігійная палітыка Казіміра Ягелончыка. Лёс Фларэнтыйскай уніі ў Вялікім княстве Літоўскім. Усходняя палітыка Казіміра Ягелончыка. Мірны дагавор 1449 г. з Масквой.

Этнічныя працэсы і культура беларускіх зямель у XIV–XV стст. Пачатак складвання беларускага этнаса. Этнічная тэрыторыя. Этнічная самасвядомасць і саманазва. Праблема паходжання назвы «Белая Русь». Фарміраванне старабеларускай мовы. Народная культура. Дойлідства і выяўленчае мастацтва. Мясцовыя традыцыі і замежныя ўплывы. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Рукапісная кніга. Арыгінальная і перакладная літаратура. Рыгор Цамблак. Беларуска-літоўскае летапісанне.

## 5. Беларусь у XVI – першай палове XVII ст.

Унутры- і знешнепалітычнае становішча Вялікага Княства Літоўскага ў першай палове і сярэдзіне XVI ст. Уступленне на трон Аляксандра. Часовы разрыў асабістай уніі з Польшчай. Абвастрэнне адносін з Масквой. Бітвы на Вядрошы і пад Оршай. Барацьба з нападамі крымскіх татар. Бітва пад Клецкам. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнай барацьбы. Мяцеж Міхаіла Глінскага, яго вынікі і наступствы. Ваенныя рэформы. Паспалітае рушанне і наёмнае войска. Рэлігійная талерантнасць у грамадска-палітычным жыцці ВКЛ. Адмена Гарадзельскага прывілея 1413 г.

Эвалюцыя дзяржаўна-палітычнага ладу Вялікага Княства

Літоўскага. Вялікакняжацкая ўлада, паны-рада, вялікі вальны сойм. Агульназемскія прывілеі 1492 і 1506 гг. Абмежаванне ўлады вялікага князя і пашырэнне паўнамоцтваў рады. Агульнадзяржаўны сойм, павятовыя соймікі. Цэнтральныя і мясцовыя органы ўлады і кіравання, іх структура і функцыі. Асаблівасці мясцовага кіравання Полацкай і Віцебскай зямель. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел. Ваяводствы, намесніцтвы, дзяржавы. Воласці. Адміністрацыйная рэформа 1565–1566 гг. Судовая сістэма і заканадаўства. Статуты Вялікага Княства Літоўскага. Судовая рэформа. Галоўны Трыбунал Вялікага княства Літоўскага.

Лівонская вайна. Прычыны Лівонскай вайны. Расстаноўка сіл напярэдадні Лівонскай вайны. Уступленне ў вайну Вялікага княства Літоўскага. Страта Полацка. Уплыў Лівонскай вайны на ўнутрыпалітычную сітуацыю ў Вялікім княстве Літоўскім. Перамір'е 1570 г. Аднаўленне ваенных дзеянняў. Паходы Стэфана Баторыя 1579–1581 гг. Завяршэнне Лівонскай вайны, яе вынікі і наступствы. Люблінская унія. Прычыны і фактары аб'яднання ВКЛ з Польшчай. Падрыхтоўка Люблінскага сойма. Расстаноўка сіл і ход перагавораў. Акт аб утварэнні Рэчы Паспалітай, яго змест і значэнне. Барацьба Вялікага княства Літоўскага за самастойнасць. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай. Інтэрвенцыя ў Маскоўскую дзяржаву. Барацьба са Швецыяй у Прыбалтыцы. Змаганне з Турцыяй. Смаленская вайна 1632–1634 гг.

Усталяванне фальваркова-паншчыннай гаспадаркі і запрыгоньванне беларускага сялянства. Панская гаспадарка. Прычыны з'яўлення фальваркаў. Сялянскае землекарыстанне. «Устава на валокі» 1557 г. Катэгорыі сялянства паводле падаткаў і павіннасцей. Памер і нормы павіннасцей. Катэгорыі сялянства паводле характару асабістай залежнасці. Працэс запрыгоньвання сялянства. Этапы заканадаўчага афармлення прыгоннага права. Антыпрыгонніцкая барацьба беларуска-

га сялянства. Гарадское жыццё на беларускіх землях. Колькасны рост гарадоў і мястэчак. Гарадскія рамёствы і цэхавая арганізацыя. Унутраны і знешні гандаль беларускіх гарадоў. Магдэбургскае права. Войты і іх улада. Функцыі і дзейнасць магістрата. Юрыдыкі. Сацыяльныя групы і этнічны склад гарадскога насельніцтва. Сацыяльныя канфлікты ў гарадах. Гарадскія паўстанні. Царква і рэлігія. Прывілеяванае становішча каталіцкага касцёла ў Вялікім княстве Літоўскім. Прыкметы крызісу праваслаўнай царквы напрыканцы XVI ст. Рэфармацыя на беларускіх землях. Галоўныя плыні і дзеячы Рэфармацыі. Пачатак Контррэфармацыі. Езуіты і іх дзейнасць. Ідэя царкоўнай уніі. Прыхільнікі і праціўнікі уніі. Берасцейскі царкоўны сабор і стварэнне уніяцкай царквы. Барацьба вакол уніяцкага пытання ў канцы XVI – першай трэці XVII стст. Праваслаўныя брацтвы і іх дзейнасць.

Адраджэнне на Беларусі. Заходнееўрапейскае Адраджэнне і Беларусь. Гуманізм. Дзеячы Адраджэння на Беларусі. Філасофскія погляды і гуманістычныя ідэалы Фр. Скарыны. Кнігадрукаванне. Выданні Скарыны і яго паслядоўнікаў. Грамадска-палітычная думка. Рэлігійна-палемічная літаратура. Праваслаўная публіцыстыка. Браты Зізаніі, М. Сматрыцкі, Л. Карповіч, А. Філіповіч. Ідэолагі каталіцтва і уніі. П. Скарга, І. Пацей. Сістэма адукацыі і навучальныя установы. Новыя рысы ў горадабудаўніцтве і архітэктуры. Выяўленчае мастацтва. Фарміраванне беларускай школы іканапісу. Тэатральнае і музычнае мастацтва.

## 6. Беларусь у сярэдзіне XVII – першай палове XVIII стст.

Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. Яе прычыны і вытокі. Паўстанне пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага ва Украіне і яго роля ў разгортванні антыфеадальнага руху ў

Беларусі. Казацкія загоны і іх кіраўнікі. Сацыяльна-саслоўны склад паўстанцаў. Баявыя дзеянні казацкіх атрадаў і шляхецкага апалчэння пад Пінскам Мазырам і Бабруйскам. Бітва пад Лоевам. Завяршэнне і вынікі казацка-сялянскай вайны. Вайна Расіі і Рэчы Паспалітай 1654–1667 гг. Прычыны і пачатак вайны. Ход і характар баявых дзеянняў. Поспехі расійскіх войск у 1654–1655 гг. Палітыка царскіх улад у Беларусі. Пазіцыя казацкай вярхушкі. Паводзіны шляхты і магнатаў. Антыфеадальныя і антымаскоўскія выступленні сялян і гараджан. Умяшанне ў канфлікт Швецыі. . Вайсковая і палітычная дзейнасць Януша Радзівіла. Кейданская унія. Ваенныя дзеянні 1658–1666 гг. і іх вынікі. Андросаўскае перамір'е. Страты Вялікага Княства Літоўскага.

Эканамічнае становішча і сацыяльныя супярэчнасці. Эканамічны заняпад Беларусі і яго прычыны. Рост буйнога феадальнага землеўладання. Сялянская і панская гаспадарка. Гарады і мястэчкі. Рамяство і гандаль. Эвалюцыя феадальнай рэнты. Дзяржаўныя падаткі. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцяў у гарадах. Сялянскія хваляванні ў Крычаўскім старостве і на Каменшчыне.

Палітычны крызіс. Арганізацыя ўлады і кіравання ў ВКЛ. Павятовыя і ваяводскія сойміківі. Недзеяздольнасць вальных соймаў. Палітычнае панаванне магнатаў у дзяржаве. Становішча дробнай і сярэдняй шляхты. Аслабленне каралеўскай улады. Узмацненне феадальнай анархіі. Саперніцтва Радзівілаў, Пацаў і Сапег. Ваенны канфлікт паміж Сапегамі і беларуска-літоўскай шляхтай. Спроба аддзялення Вялікага Княства Літоўскага ад Польшчы. Рост уплыву каталіцкай царквы. Далейшае распаўсюджванне уніяцтва. Становішча іншых канфесій. Паўночная вайна ў Беларусі. Прычыны і пачатак Паўночнай вайны. Ход баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. Паводзіны іншаземных войск. Адносіны насельніцтва да ваюючых бакоў. Выступленні шляхецкіх гру-

повак. Выкарыстанне казацка-сялянскіх атрадаў. Выбранне каралём Станіслава Ляшчынскага. Сандамірская канфедэрацыя. Бітва пры Лясной і яе значэнне.Вынікі вайны для Беларусі. Узмацненне расійскіх уплываў у Рэчы Паспалітай. Культура беларускіх земляў ВКЛ.

Гістарычныя ўмовы этнакультурнага развіцця. Афіцыйная забарона беларускай мовы. Працэс паланізацыі і яго вынікі. Стан школьнай асветы і выхавання. Езуіцкія калегіумы. Віленская акадэмія, яе роля ў распаўсюджванні навуковых ведаў. «Вялікае мастацтва артылерыі» К. Семяновіча. Развіццё фальклору. Тэатр. Інтэрмедыі. Батлейка. Літаратура. Кнігадрукаванне. Грамадска-палітычная думка. Сімяон Полацкі і яго дзейнасць. А. Белабоцкі. К. Лышчынскі. І. Капіевіч. Сарматызм як ідэалогія шляхты. Архітэктура скульптура і жывапіс. Стыль барока. Развіццё прыкладнога мастацтва.

## 7. Беларусь у другой палове XVIII ст.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Нармалізацыя эканамічнага жыцця ў Беларусі. Аднаўленне сельскай і гарадской гаспадаркі. Рост насельніцтва. Развіццё шляхоў зносін.

Пачатак разлажэння феадальнай фармацыі. Панская гаспадарка і спробы яе рацыяналізацыі. Рэфарматарская дзейнасць Антонія Тызенгаўза. Сялянская гаспадарка і катэгорыі сялян. Вотчынныя мануфактуры. Унутраны і знешні гандаль. Развіццё гарадоў. Вынікі і характар эканамічнага ажыўлення. Становішча гарадскога і вясковага насельніцтва. Спробы дзяржаўных рэформ.

Першы і другі падзелы Рэчы Паспалітай. Прычыны падзення Рэчы Паспалітай. Абвастрэнне барацьбы паміж шляхецкімі групоўкамі ў 60-х – пачатку 70-х гадоў XVIII ст. Умяшанне суседніх дзяржаў. Дысідэнцкае пытанне. Канфедэрацкі рух. Першы падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне ўсходняй часткі

Беларусі да Расіі. Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці ў Рэчы Паспалітай у 80-х гадах. Рэформы Чатырохгадовага сойма. Канстытуцыя Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Барацьба ўнутраных і знешніх сіл супраць канстытуцыі. Другі падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне да Расіі цэнтральнай часткі Беларусі. Паўстанне 1794 г. Ліквідацыя Рэчы Паспалітай. Падрыхтоўка і пачатак паўстання ў Полынчы. Тадэвуш Касцюшка. «Віленскія якабінцы». Якуб Ясінскі. Перамога паўстання ў Вільні. Найвышэйшая Літоўская Рада. Пашырэнне паўстання на Беларусі. Фарміраванне і баявая дзейнасць паўстанцкіх атрадаў. Адносіны да паўстання сялян. Паланецкі універсал. Палітыка расійскага ўрада. Карныя аперацыі царскіх войск. Прычыны паражэння паўстання. Трэці падзел Рэчы Паспалітай і далучэнне да Расіі заходняй часткі Беларусі.

Беларускія землі пасля падзелаў Рэчы Паспалітай (1772–1801 гг.). Увядзенне новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу і арганізацыя кіравання. Судаводства. Змены ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, унутраным і знешнім гандлі. Паштовыя дарогі. Стан гарадоў. Прывядзенне да прысягі і афармленне сацыяльнага статусу насельніцтва. Правы і прывілеі пануючага саслоўя. Падаткі і павіннасці. Насаджэнне рускага дваранскага землеўладання. Нацыянальна-рэлігійная палітыка царызму. Культура. Асветніцтва, своеасаблівасць і супярэчлівасць гэтай эпохі на Беларусі. Пачатак секулярызацыі асветы і навукі. Дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Галоўная школа Вялікага княства Літоўскага. Гродзенская медыцынская школа. Дасягненні прыродазнаўчых навук. М. Пачобут-Адляніцкі. Ж. Жылібер. Ідэі Асветніцтва ў літаратуры і грамадскай думцы. С. Майман. К. Нарбут. І. Яленскі. Г. Каніскі. Фізіякраты. Мецэнацтва. Прыгонныя тэатры. Музычнае мастацтва. Камедыі К. Марашэўскага і М. Цяцерскага. Друк, першыя газеты. Архітэктура і жывапіс. Класіцызм. Палацава-сядзібнае будаўніцтва.

# АСНОЎНЫЯ ТЭРМІНЫ І ПАНЯЦЦІ, ЯКІЯ ЗАСВОЙВАЮЦЦА ПАДЧАС ВЫВУЧЭННЯ КУРСА

*Адраджэнне (Рэнесанс)*
*Адукацыйная камісія*
*Анексія*
*Археалагічная культура*
*Асветніцтва*
*Ачыншаванне*
*Валока*
*Веча*
*Волакі*
*Гвалты*
*Вытворчая гаспадарка*
*Даніна*
*Дзяржавы*
*Дысідэнты*
*Загоны*
*Канвакацыйны сойм*
*Канфедэрацыя*
*Каранацыйны сойм*
*Контррэфармацыя*
*Liberum veto (ліберум вета)*
*Люстрацыя*
*Магдэбургскае права*
*Мануфактура*
*Матрыярхат*
*Натуральная гаспадарка*

*Неалітычная рэвалюцыя*
*Палюддзе*
*Паншчына*
*Першабытнаабшчынны лад*
*Прыгоннае права*
*Прысвойвальная гаспадарка*
*Род*
*Родавая абшчына*
*Рокаш*
*Рэфармацыя*
*Рэлігія*
*Сінкрэтызм*
*Слабада*
*Статут ВКЛ 1588 г. (III Статут ВКЛ)*
*Сталовыя эканоміі*
*Староствы*
*Талака*
*Урбанізацыя.*
*Цэх*
*Чынш*
*Шарваркі*
*Шматукладная гаспадарка*
*Элекцыйны сойм*
*Этнас*
*Фальварак*
*Феадальная раздробленасць*

# ХРАНАЛОГІЯ ПАДЗЕЙ

***100–35 тыс. гадоў да н. э.*** – час з’яўлення першых людзей на тэрыторыі Беларусі.

***100–10 тыс. гадоў да н. э.*** – палеаліт.

***9–5 тыс. гадоў да н. э.*** – мезаліт.

***Канец 5–3 тыс. да н. э.*** – неаліт.

***2 тыс. да н. э. – VIII ст. да н .э.*** – бронзавы век.

***VII ст. да н .э. – VII ст. н. э.*** – жалезны век.

***VII–VIII ст. н. э.*** – масавае рассяленне славян на тэрыторыі Беларусі.

***VI–VIII ст. н. э***. – існаванне шматукладнай гаспадаркі.

***859 г.*** – першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых гадоў» пра крывічоў.

***862 г.*** – першае ўпамінанне ў «Аповесці мінулых гадоў» пра Полацк.

***980 г.*** – згадка ў летапісе пра полацкага князя Рагвалода і Рагнеду.

***980 г.*** – першае ўпамінанне пра Тураў.

***988 г.*** – пачатак прыняцця хрысціянства на ўсходнеславянскіх землях.

***992 г.*** – узнікненне епархіі ў Полацку.

***1005 г.*** – узнікненне епархіі ў Тураве.

***1067 г.*** – бітва на Нямізе і першае ўпамінанне ў летапісе пра Менск.

***1101 г.*** – пачатак феадальнай раздробленасці на беларускіх землях.

***1246 г.*** – Міндоўг прыняў праваслаўе і стаў Наваградскім князем.

***1362 г.*** – разгром Альгердам мангола-татар на рацэ Сінія Воды.

***1368 г., 1370 г., 1372 г.*** – ваенныя паходы Альгерда на Маскву.

***1385 г.*** – заключэнне Крэўскай уніі.

***1399 г.*** – паражэнне войска ВКЛ ад татар у бітве на рацэ Ворскле.

***1409–1411 г.*** – «Вялікая вайна» ВКЛ і Польскага каралеўства супраць Тэўтонскага ордэна.

***1410 г.*** – Грунвальдская бітва – асноўная бітва «Вялікай вайны», якая скончылася паражэннем Тэўтонскага ордэна.

***1413 г.*** – заключэнне Гарадзельскай уніі.

***1432–1436 г.*** – грамадзянская вайна ў ВКЛ.

***1447 г.*** – Прывілей Казіміра Ягелончыка, які замацаваў шырокія правы баяр ВКЛ у палітычным, сацыяльным і эканамічным жыцці дзяржавы.

***1468 г.*** – першы кодэкс крымінальна-працэсуальнага права ў ВКЛ, складзены на аснове мясцовага звычаёвага права і судова-адміністрацыйнай практыкі.

***1517 г.*** – выданне Францыскам Скарынам «Бібліі» – першай усходнеславянскай друкаванай кніжкі.

***1557 г.*** – выданне «Уставы на валокі» – галоўнага дакумента вялікай аграрнай рэформы XVI ст.

***1558 – 1583 г.*** – Лівонская вайна.

***1569 г.*** – падпісанне Люблінскай уніі і ўтварэнне Рэчы Паспалітай.

***1529 г., 1566 г., 1588 г.*** – прыняцце Статутаў ВКЛ.

***1596 г.*** – падпісанне Берасцейскай царкоўнай уніі і ўтварэнне новай хрысціянскай канфесіі – уніяцкай.

***1648 – 1651 г.*** – казацка-сялянская вайна.

***1654 – 1667 г.*** – вайна Маскоўскай дзяржавы з Рэччу Паспалітай за беларускія землі.

***1700 – 1721 г.*** – Паўночная вайна.

***1717 г.*** – «нямы» сойм у Варшаве.

***1765 – 1780 г.*** – рэфарматарская дзейнасць А. Тызенгаўза ў каралеўскіх сталовых эканоміях ВКЛ.

***1772 г.*** – першы падзел Рэчы Паспалітай.

***1773 – 1794 г.*** – дзейнасць Адукацыйнай камісіі.

***3 мая 1791 г.*** – прыняцце Канстытуцыі Рэчы Паспалітай.
***1793 г.*** – другі падзел Рэчы Паспалітай.
***1794 г.*** – паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі.
***1795 г.*** – трэці падзел Рэчы Паспалітай.

# РЭКАМЕНДАВАНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Алексеев Л. В. Полоцкая земля в IX–XIII вв. – М., 1966.
2. Анішчанка Я. Беларусь у часы Кацярыны II. – Мінск, 1996.
3. Анішчанка Я. Інкарпарацыя. Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай. – Мінск, 2003.
4. Арлоў У. А. Таямніцы полацкай гісторыі. – Мінск: Беларусь, 1994.
5. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. – Мінск : БелЭн, 1993.
6. Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск, 1997.
7. Бохан Ю. М. Войска ВКЛ у другой палове XIV – канцы XVI ст. – Мінск, 2002.
8. Вішнеўскі А. Ф., Юхо Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах. – Мінск, 1998.
9. Галубовіч В. І. Эканамічны стан, побыт і гандаль Старажытнай Беларусі (IX–XIII стст.). – Мінск: Экаперспектыва, 1997.
10. Ганцова С. К., Чамярыцкі В. А., Штыхаў Г. В. Сведкі беларускай мінуўшчыны: Зборнік дакументаў і матэрыялаў па гісторыі Беларусі VI–XV стст. – Мн.: НІА, 1996.
11. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Старажытная Беларусь: Ад пачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – Мінск : Экаперспектыва, 2000.
12. Гісторыя Беларусі ў табліцах і схемах. Са старажытнах часоў да сучаснасці / Склад Л. М. Нагорная, А. В. Цімашэй. – Мн.: ТАА Юніпрэс,1999.
13. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI–XV стст.). Дапаможнік для вучняў і настаўнікаў / пад рэд. Г. В. Штыхава – Мн.: Народная асвета, 1998.
14. Гісторыя сялянства Беларусі: У 3 т. Т. 1. Гісторыя сялянства

Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. – Мінск: Беларуская навука, 1997.
15. Голубеў В. Ф. Вялікая аграрная рэформа XVI ст. // Спадчына. – 1993. – № 4. – С. 63–78.
16. Голубеў В. Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі: XVI – XVIII стст. – Мінск, 1992. – С. 21–90.
17. Голубеў, В. Ф. Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. – Мінск : Беларус. навука, 2008.
18. Горемыкина В. И. История первобытного общества. – Минск : Выш. шк., 1973.
19. Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. – Минск, 1975.
20. Загорульский Э. М. Древняя история Белоруссии (очерки этнической истории и материальной культуры до IX в.). – Минск : Изд-во БГУ, 1977.
21. Емельянчык У. П. Паланез для касінераў. З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі на Беларусі. – Мінск, 1994.
22. Ермаловіч М. І. Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае. – Мінск, 2000.
23.Іванова Л. Рэфармацыйны рух на Беларусі (другая палова XVI – першая палова XVII стст.) // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 2. – С. 65–85.
24. Калечиц Е. Г. Первоначальное заселение территории Белоруссии. – Минск, 1984.
25. Кітурка І. «За вольнасць і больш заплацяць»: спрэчкі пра аграрныя рэформы ў ВКЛ у другой палове XVIII ст. // Спадчына. – 2002. – № 4.
26. Кітурка І. Ф. Дзяржаўныя ўладанні на землях Беларусі ў другой палове XVII – XVIII ст.: палітыка гаспадарчага аднаўлення і развіцця. – Гродна, 2003.
27. Копытин В. Р. Каменный век на территории Белоруссии. – Минск : Изд-во МГПИ, 1990.

28. Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI – первой половине XVII вв. – Минск, 1966.
29. Краўцэвіч А. К. Стварэнне Вялікага княства Літоўскага. – Мінск, 1998.
30. Лойка П. А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі: эвалюцыя феадальнай рэнты ў другой палове XVII–XVIII ст. – Мінск, 1991
31. Лойка П. А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. – Мінск, 2001.
32. Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. – Мінск: Экаперспектыва, 1997.
33. Мальдзіс А. І. На скрыжаванні славянскіх традыцый: Літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII–XVIII ст.). – Мінск, 1980.
34. Мараш Я. Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795). – Мн., 1971.
35. Марозава С. В. Уніяцкая царква ў этнакультурным развіцці Беларусі (1596–1839 гады). – Гродна, 2001.
36. Мелешко В. И. Очерки аграрной истории Восточной Беларуси (вторая половина XVII–XVIII в.). – Мінск, 1975.
37. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. – Мінск, 1994–1995.
38. Насевіч В. Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага: Падзеі і асобы. – Мінск, 1993.
39. Падокшын С. А. Філасофская думка эпохі Адраджэння ў Беларусі. – Мінск, 1990.
40. Піваварчык С., Семянчук Г. Археалогія Беларусі. – Гродна, 1997.
41. Пичета В. И. Аграрная реформа Сигизмунда Августа в Литовско-Русском государстве. – М.: Изд-во АН СССР, 1958. – С. 183–202.

42. Похилевич Л. Д. Крестьяне Белоруссии и Литвы в XVI – XVIII в. – Львов, 1957.
43. Похилевич Л. Д. Крестьяне Белоруссии и Литвы во второй половине XVIII в. – Вильнюс, 1966.
44. Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667. – Мінск, 1995.
45. Сагановіч Г. Нарыс гісторыі Беларусі ад старажытнасці да канца XVIII стагоддзя. – Мінск, 2001.
46. Саракавік І. А. Беларусазнаўства. – Мінск : Веды, 1998.
47. Спиридонов М.Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.). Минск: Наука и техника, 1993
48. Чарняўскі М. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. – Мінск : Народная асвета, 1981.
49. Штыхаў Г. В. Шматукладнае грамадства IX – XI стст. і пытанні перыядызацыі раннесярэдневяковай гісторыі Беларусі // Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі ад старажытных часоў да нашых дзён. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1992.
50. Штыхов Г. В., Лысенка П. Ф. Древнейшие города Белоруссии. – Минск.: Наука и техника, 1966.
51. Штыхаў Г. В. Старажытныя дзяржавы на тэрыторыі Беларусі. – Мінск, 1999.
52. Эканамічная гісторыя Беларусі: Курс лекцый / Пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. – Мн.: Экаперспектыва, 2001.
53. Юхо Я. А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. – Мінск, 1992.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

## Літаратура ад рамантызму да сімвалізму і нашаніўскага адраджэння

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*

Склалі:
*Баршчэўскі Лявон*,
кандыдат філалагічных навук,
*Тычына Міхась*,
доктар філалагічных навук

# УСТУП

## Літаратура як дысцыпліна ў гуманітарным ліцэі

***Да гісторыі пытання.*** З савецкіх часоў у беларускіх сярэдніх і вышэйшых навучальных установах існуе штучны падзел літаратурнай адукацыі, абумоўлены, відавочна, неабходнасцю ажыццяўлення імперскай палітыкі ў дачыненні да «малых» народаў Расійскай імперыі і постсавецкай прасторы. Неабходнасць паслядоўнага ажыццяўлення палітыкі русіфікацыі на савецкіх і, па магчымасці, на постсавецкіх прасторах патрабавала пастаяннага сцвярджэння абсалютнага дамінавання рускай мовы ў грамадскім, а з часам і ў прыватным жыцці. Сумнавядомыя рашэнні цэнтральнага камітэта бальшавіцкай партыі аб узмацненні вывучэння рускай мовы, якія прымаліся ў СССР пачынаючы ад 30-х гадоў мінулага стагоддзя, напраўду былі скіраваныя на прыніжэнне і маргіналізацыю моў нацыянальных. Праз увядзенне абавязковага прадмета «русская литература», на які ў вучэбных планах адводзілася істотна большая колькасць гадзін, чым на літаратуры нацыянальныя, вялікі патэнцыял класічнай расійскай літаратуры ў савецкіх школах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах быў пастаўлены на службу савецка-імперскай палітыкі. Цэлым пакаленням савецкіх людзей змалку ў галовы паслядоўна ўводзілася думка, што «сапраўдную» літаратуру стваралі і ствараюць Грыбаедаў і Карамзін, Пушкін і Лермантаў, Гогаль і Тургенеў, Астроўскі і Чэхаў, Талстой і Дастаеўскі. Маякоўскі

і Шолахаў, а творчасць Тараса Шаўчэнкі, Лесі Украінкі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Грыгора Нарэкацы, Аванэса Туманяна, Мірзы Фаталі Ахундава, Шата Руставелі. Ніколаза Бараташвілі, Вінцаса Кудзіркі ці Яніса Райніса – гэта адно толькі экзатычны «этнаграфічны дадатак» да адзіна вялікай і гуманістычнай расійскай літаратуры. Пры гэтым некаторыя з самых выбітных творцаў народаў расійска-савецкай імперыі ўвогуле замоўчваліся (гэта рабілася ў дачыненні да тых, хто дажыў да 1917 года і паспеў «не прыняць» савецкую ўладу), а з даробку іншых для вывучэння выбіраліся найчасцей іх далёка не самыя лепшыя творы.

Вельмі абмежаваным, а ў шэрагу выпадкаў зведзеным практычна да нуля, у савецкай школе было вывучэнне твораў замежнай літаратуры: да адзінкавых твораў Шэкспіра, Гётэ або Бальзака далучалі не самай лепшай якасці літаратурныя практыкаванні пісьменнікаў XX стагоддзя, якія пры гэтым мусілі быць «вялікімі сябрамі Савецкага Саюза». Вывучэнне літаратуры ў савецкай сярэдняй школе было часткай адпаведнага ідэйнага выхавання моладзі, і за сапраўдную літаратуру прызнаваліся збольшага творы, напісаныя ў межах крытычнарэалістычнай мастацкай сістэмы, а вяршыняй дасягненняў літаратур усіх часоў і народаў лічыліся, вядома ж, творы сацрэалізму.

Працэсы набыцця рэспублікамі Савецкага Саюза суверэннага і незалежнага статуса, што мелі месца ў канцы 80-х – пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя, непазбежна вялі да разумення таго, што такое становішча з літаратурнай адукацыяй мусіць быць зменена, прытым зменена карэнным чынам. У Беларусі, з прычыны захавання ўлады прадстаўнікамі ранейшай камуністычнай партыйнай вярхушкі, а таксама асаблівага кансерватызму вялікай часткі адукацыйных чыноўнікаў, гэтыя змены дагэтуль удалося ажыццявіць у вельмі абмежаваным маштабе. У масавай школе, ліцэях, гімназіях да сён-

ня захоўваюцца штучны падзел літаратурнай адукацыі на два асобныя прадметы – «русская литература» і «беларуская літаратура». Пры гэтым, калі ў праграмы па расійскай літаратуры ў той ці іншай форме ўключанае вывучэнне абсалютнай большасці сапраўдных яе шэдэўраў, то, скажам, у дзейнай цяпер праграме па беларускай літаратуры для агульнаадукацыйных установаў адсутнічаюць нават згадкі пра такія класічныя творы нашай літаратуры, як «Немец» Францішка Багушэвіча, «Лабірынты» Вацлава Ластоўскага, «Тутэйшыя» Янкі Купалы, «Пагоня» Максіма Багдановіча, «У капцюрох ГПУ» і ўсе драматычныя творы Францішка Аляхновіча, «Мёртвым не баліць», «Аблава» Васіля Быкава, публіцыстычная паэзія Ніла Гілевіча і Рыгора Барадуліна... Фактычна забароненай для вывучэння школьнікамі застаецца ўся творчая спадчына Ларысы Геніюш, Наталлі Арсенневай і ўсёй ідэйнай беларускай эміграцыі XX стагоддзя. Выключаныя цалкам або амаль цалкам з праграмы абавязковага вывучэння і азнаямлення кнігі прыпавесцяў Васіля Быкава, творы Генадзя Бураўкіна, Уладзіміра Някляева, Вольгі Іпатавай, Уладзіміра Арлова, Анатоля Сыса.

Стварэнне ў 1990–91 гг. гуманітарнага ліцэя з беларускай мовай навучання пад эгідай міністэрства адукацыі дало магчымасць педагогам ліцэя працаваць над уласнымі, аўтарскімі праграмамі па гуманітарных дысцыплінах. Выкладчыкі ліцэя, кандыдат філалагічных навук, тагачасны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі Пятро Васючэнка, а таксама Алег Дышлевіч распрацавалі праграмы па двух асобных дысцыплінах, «Літаратура народаў свету» і «Беларуская літаратура», якія на пачатку 1992 г. былі зацверджаныя Міністэрствам адукацыі ўжо незалежнай Рэспублікі Беларусь для выкарыстання ў ліцэі Беларускага гуманітарнага адукацыйна-культурнага цэнтра і яго філіях у Гродне, Брэсце, Магілёве, Гомелі, Светлагорску, Дзяржынску і

Наваполацку. Праца па гэтых праграмах дазволіла назапасіць неабходны досвед і перайсці да распрацоўкі сінтэтычнага курса «Літаратура», у стварэнні якога прымалі ўдзел, побач за згаданым Пятром Васючэнкам, таксама аўтары гэтай праграмы і малодшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры Акадэміі навук Ігар Шаладонаў. Гэтая праграма, зацверджаная Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1995 і 2001 гг., у асноўным застаецца актуальнай і па сённяшні дзень: на яе аснове распрацаваны гэты варыянт. У параўнанні з папярэднімі праграмамі тут узмоцнена прысутнасць твораў класічнай польскай літаратуры, бо гэтая літаратура ў свядомасці беларусаў доўгі час была параўнальная ў сваіх уплывах з уплывамі расійскай літаратуры, а часам і мела прыярытэт.

Вышэйзгаданыя педагогі Беларускага гуманітарнага ліцэя ў другой палове 1990-х гадоў удзельнічалі ў распрацоўцы канцэпцыі літаратурнай адукацыі ў ліцэях і гімназіях для 12-гадовай сярэдняй школы і распрацавалі адпаведныя праграмы сінтэтычнага курса літаратуры, якія, аднак, у канчатковым выніку не былі ўведзеныя ва ўжытак па-за Беларускім гуманітарным ліцэем (а пазней канцэпцыя 12-гадовай сярэдняй адукацыі была наогул пахаваная паводле ініцыятывы ўладных структур).

Трэба таксама адзначыць, што курс літаратуры ў грамадскім Беларускім гуманітарным ліцэі выкладаецца ў цесным спалучэнні з курсам айчыннай і сусветнай мастацкай культуры, які – у асноўных рысах – грунтуецца на адпаведных праграмах, створаных Міністэрствам адукацыі ў 1997–2006 гг., а цяпер наогул адсутнічае ў праграмах агульнаадукацыйнай сярэдняй школы. Практыка выкладання дысцыплін «Літаратура» і «Мастацкая культура» ў спалучэнні на працягу апошніх паўтара дзясятка гадоў пацвердзіла сваю эфектыўнасць. Гэты досвед у значнай ступені быў запазыча-

ны з досведу суседніх краін: так, першаўзорам для аўтараў гэтай Праграмы служылі адпаведныя праграмныя асновы некалькіх пакаленняў, прынятыя міністэрствам адукацыі Рэспублікі Польшча. Нельга не заўважыць, што польскі досвед выкладання літаратурных дысцыплін у сярэдняй школе істотным чынам улічваўся акадэмікам М. А. Лазаруком, пад кіраўніцтвам якога у пачатку 1990-х гг. распрацоўвалася першая ў незалежнай Беларусі «Канцэпцыя літаратурнай адукацыі», ствараліся адпаведныя праграмы вывучэння беларускай літаратуры ў сярэдняй школе, пісаліся падручнікі па гэтым прадмеце.

## МЕТАДЫЧНАЯ НАТАТКА

Дысцыпліна «Літаратура» ў гуманітарным ліцэі арыентаваная на стварэнне для навучэнцаў магчымасцяў развіцця ўменняў і навыкаў, набытых імі на папярэднім этапе навучання. Курс літаратуры ў ліцэі скіраваны на спасціжэнне рэчаіснасці праз літаратурна-мастацкія вобразы, пашырэнне творчых здольнасцяў падлеткаў і моладзі. Акрамя традыцыйных формаў урока або лекцыі павінны шырока практыкавацца семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі, імправізаваныя прэзентацыі новых кніг, абмеркаванне экранізацый паасобных класічных твораў, спектакляў, створаных паводле іх. У суме метады навучання так ці іначай павінны спрыяць выяўленню самых розных функцый літаратуры: эўрыстычнай, выхаваўчай, камунікатыўнай. Агульным патрабаваннем для ўсіх метадаў навучання ёсць яго арыентацыя на мастацкую спецыфіку літаратуры як аднаго з відаў мастацтва, яе эстэтычную сутнасць. Пры гэтым творчае засвойванне курса літаратуры павінна спрыяць як мага больш поўнай рэалізацыі задач грамадзянскага і патрыятычнага выхавання.

### *Патрабаванні да ўменняў і навыкаў навучэнцаў на этапе III года навучання ў ліцэі*

I. Успрыманне пісьмовых выказванняў і выкарыстанне іх зместу.

*Навучэнец павінен*: разумець тэксты складанай пабудовы; выяўляць сэнс, закладзены ў глыбіннай структуры тэксту; распазнаваць функцыі і асаблівасці мастацкага тэксту і моўныя сродкі, якія служаць іх увасабленню; умець пісьменна і дакладна фармуляваць свае вусныя і/або пісьмовыя выказванні на літаратурныя тэмы.

II. Аналіз і інтэрпрэтацыя літаратурных тэкстаў як тэкстаў культуры.

Навучэнец ужывае ў сваім аналізе найважнейшыя паняцці паэтыкі; у інтэрпрэтацыі тэксту выкарыстоўвае веды наконт кантэкстаў, у якіх дадзены тэкст можа быць успрыняты; разбіраецца ў неабходных для спасціжэння фактах з гісторыі літаратуры і іншых галін гуманістыкі; умее вылучыць розныя сюжэтныя лініі або стылістычныя плыні твора; здольны рабіць параўнаўчы аналіз твораў у кантэксце адпаведных літаратурных эпох.

III. Стварэнне выказванняў

Навучэнец стварае выказванні высокай ступені складанасці, умее карыстаца асноўнымі прынцыпамі логікі і рыторыкі, умее аб’ектыўна ацэньваць уласную моўную кампетэнтнасць.

### *Асаблівасці літаратурнай адукацыі III года навучання ў ліцэі*

На старэйшых курсах ліцэя навучэнец уваходзіць у стадыю дарослага жыцця: гэта час эмацыйнага і інтэлектуальнага даспявання яго асобы. Самастойныя рашэнні і дзеянні робяцца

галоўнай рысай жыццёвай пазіцыі маладога чалавека, якую ён гатовы бараніць як незалежнасць сваёй асобы. У гэты час навучэнец, як правіла, робіцца свядомым спажыўцом культуры, набывае здольнасці сінтэзавання і сістэматызавання з'яў, звязаных з моўна-культурнымі традыцыямі свайго народа і навакольнай рэчаіснасцю. Чытанне літаратурных тэкстаў дазваляе яму фармуляваць жыццёва важныя пытанні і шукаць адказы на іх.

У гэтай сітуацыі роля выкладчыка палягае на разумным і далікатным кіраванні, стымуляванні самастойнага развіцця асобы навучэнца, матываванні яго да ўдумлівага падыходу ва ўспрыманні тэкстаў літаратурных твораў. Варта асабліва адзначыць, што на гэтым этапе свайго жыцця навучэнцы асабліва ўразлівыя што да пытання сваёй суб'ектнасці. Пры асабліва яскрава выяўленым крытычным стаўленні да навакольнага свету ў асобе маладога чалавека адначасова развіваюцца рысы талерантнасці да «іншасці». Задачай педагога ў такой сітуацыі ёсць стымуляванне такіх працэсаў, цярплівае і ненавязлівае прышчапленне навучэнцам умення паважаць іншыя думкі і іншы светапогляд.

У параўнанні з папярэднімі этапамі вывучэння літаратуры – як розных курсаў у першых сямі класах агульнаадукацыйнай школы і сінтэтычнага курса ў першыя два гады навучання ў гуманітарным ліцэі – курс літаратуры III года ліцэя арыентаваны на паглыбленне пройдзенага матэрыялу ў вывучэнні літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзяў; пры гэтым вучні часткова вяртаюцца да вывучаных ужо аўтараў, але на прыкладзе тых твораў, што раней імі не праходзіліся. Выкладчык павінен увесь час дбаць пра тое, што раней набытыя веды, уменні і навыкі павінны знаходзіць не гэтулькі колькаснае, колькі якаснае развіццё. Гэты вельмі істотны элемент судачыненняў паміж рознымі этапамі навучання павінен адыгрываць найважнейшую ролю ў кантэксце абмеркавання на занятках па літаратуры канкрэтных твораў, напісання разнастайных творчых прац кшталту сачынення або міні-эсэ.

Вывучэнне літаратуры на трэцім курсе ліцэя мае на мэце, у т. л. фармаванне ў навучэнцаў гістарычна-літаратурнай свядомасці. Навучэнец павінен беспамылкова ўмець вызначаць прыналежнасць фрагментаў класічных тэкстаў да адпаведных эпох і плыняў, у т. л. праз асаблівасці іх моўнага ўвасаблення. Найлепшыя навучэнцы павінны вучыцца распазнаваць *знакі традыцыі* – напрыклад, антычнай, усходняй, сярэднявечна-хрысціянскай, рэнесансавай і г. д. Гэта зусім не значыць, што навучэнцы павінны засвоіць менавіта курс гісторыі літаратуры ў храналагічным парадку. Найважнейшай задачай ёсць фармаванне ў іх навыку распазнавання асаблівасцяў *вобразнага мыслення* людзей розных эпох і цывілізацыйных колаў. Іншым, магчыма яшчэ больш важным, кампанентам літаратурнай адукацыі ў ліцэі можа быць развіццё ў маладых людзей навыкаў мыслення ў аспекце праблемнага падыходу. Выкладчык павінен стымуляваць выказванне навучэнцамі альтэрнатыўных – у параўнанні са сфармуляванымі ў навучальных дапаможніках – думак. Адзінай умовай пры гэтым павінна быць імкненне знаходжання як мага больш пераканаўчых аргументаў на карысць сваёй думкі.

Галоўнай мэтай літаратурнай адукацыі на заключным этапе навучання ў ліцэі павінна быць фармаванне ў маладых людзей навыкаў і ўменняў свядомага ўспрымання пісьмовых выказванняў любых жанраў, у т. л. і пазалітаратурных. Навучэнец павінен стаць свядомым карыстальнікам беларускай літаратурнай мовы, які ўмее распазнаваць розныя формы актаў ілакуцыі і самастойна ствараць пісьмовыя выказванні розных жанраў і памераў, ужываючы патрэбныя дзеля гэтай мэты моўныя сродкі. Пры гэтым неабходна трымацца прынцыпу раўнапраўнасці непадзельнасці лінгвістычных і літаратурна-тэарэтычных сродкаў, не аддаючы выразнай перавагі адной з гэтых груп і разумеючы, што для адэкватнага і поўнага ўспрымання канкрэтных тэкстаў патрэбны пэўны ўзровень моўна-камунікатыўнай кампетэнтнасці.

Аналіз і інтэрпрэтацыя тэксту належыць да базавых навыкаў, неабходных у жыцці кожнаму чалавеку. Вучні пачынаюць аналізаваць літаратурныя факты яшчэ ў пачатковай школе і з дапамогай іх супастаўлення і параўнання падступаюцца да інтэрпрэтацыйных дзеянняў. Навучэнцы ліцэя павінны ў поўным аб'ёме авалодаць аналітычным мысленнем праз рэалізацыю наступнай схемы:

успрыманне→аналіз→інтэрпрэтацыя→стварэнне ўласнага тэксту.

Менавіта аналіз і інтэрпрэтацыя ствараюць аснову, на якой грунтуецца засваенне праграмы па літаратуры ў ліцэі. Маецца на ўвазе, што моўна-літаратурная, а больш шырока – гуманістычная, адукацыя на папярэднім этапе атрымання базавай літаратурнай адукацыі ўжо наблізіла навучэнцаў да пачуццёвага ці рацыянальнага ўспрымання такіх паняццяў, як: пакуты, радасць існавання, каханне, спачуванне ахвярам, патрыятызм і г. д. У кожным выпадку, яны выразна сабе ўсвядомілі, што форма літаратурнага выказвання і яе значэнне знаходзяцца ў непарыўнай сувязі са зместам, ідэяй, праблематыкай таго ці іншага твора.

Навучанне на старэйшых курсах ліцэя павінна быць скіраваным на ўпарадкаванне наяўных ведаў, уменняў і навыкаў, усведамленне ўзаемадачыненняў паміж рознымі з'явамі і паняццямі літаратуры, філасофіі і мастацтва, спасціжэнне сутнасці працэсаў, што адбываюцца ў сферы культуры. Пры гэтым вельмі важна, каб навучэнцы выразна бачылі і асэнсоўвалі ўзаемазалежнасць, узаемапранікальнасць гэтых працэсаў, іх дыферэнцыраваны характар і магчымасць фармулявання аналогій.

Навучэнцы ў працэсе чытання, аналізу і інтэрпрэтацыі канкрэтных твораў засвойваюць найважнейшыя літаратуразнаўчыя паняцці: роды, жанры, сюжэт, кампазіцыя, стыль, вобразна-выяўленчыя сродкі, тыпы герояў-персанажаў, літа-

ратурны працэс, літаратурна-мастацкі напрамак, сістэма вершавання, страфа і інш.

Выкладчык не павінен успрымаць прапанаваны спіс літаратурных тэкстаў, прызначаных для вывучэння ў поўным аб'ёме ці ў фрагментах, як догму. Ён можа замяняць тэксты, што не ўваходзяць у абавязковую школьную праграму па сваёй ініцыятыве – галоўнае, каб у навучэнцаў пастаянна развівалася ўменне бачыць традыцыю ў сучаснасці, рабіць моўны і літаратуразнаўчы аналіз любога фрагмента з кожнага прапанаванага для знаёмства тэксту.

Радыкальныя змены ў інфарматыўна-камунікатыўнай прасторы, якія адбываюцца ва ўсім свеце ў апошнія дзесяцігоддзі, адным са сваіх адмоўных вынікаў маюць істотнае зніжэнне інтарэсу моладзі да чытання тэкстаў, што патрабуюць напружанай мыслядзейнасці і асаблівага эмацыйнага настрою дзеля іх адэкватнага ўспрымання. Таму надзвычай важным уяўляецца надаванне асаблівай увагі вырашэнню задачы фармавання ў ліцэістаў *чытацкіх навыкаў і ўменняў*, а ў першую чаргу наступных:

- уменняў і навыкаў, звязаных з эстэтычным успрыманнем літаратурнага твора або яго фрагмента (уяўленне малюнкаў і вобразаў, створаных пісьменнікам; здольнасць эмацыйна адгукацца на «заклік» аўтара; выказванне першаснага, імпрэсіяністычнага ўражання і да т. п.);
- аналітычных уменняў і навыкаў (аналіз і інтэрпрэтацыя сюжэта, эпізоду, кампазіцыі, мовы твора або перакладу);
- сінтэзавальных уменняў і навыкаў (здольнасць супастаўляць, абагульняць, рабіць высновы);
- уменняў і навыкаў, звязаных з асабістай ацэнкай мастацкага твора (уменне зразумець і адчуць яго пафас, аўтарскае разуменне жыцця і чалавечай асобы, здольнасць ацэньваць глыбіню праблематыкі, арыгінальнасць вобразаў, адметнасць стылю і г. д.).

# ЗМЕСТ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА

**III год навучання**

**Уводзіны** (1 г.)**.** Канец XVIII і пачатак XIX стагоддзя – пераломная эпоха ў гісторыі літаратур Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

## Літаратура рамантызму (81 г.)

Рамантызм як напрамак і як універсальная мастацкая сістэма.

Нямецкія рамантычныя школы. Гофман і «гафманізм». «Кніга песень» Гайнрыха Гайнэ.

Асаблівасці англійскага рамантызму. Джордж Гордан Байран і яго паэма «Паломніцтва Чайльд-Гарольда».

Паўночнаамерыканскі рамантызм. Эдгар Алан По.

Асаблівасці развіцця рамантызму ў Польшчы, Беларусі і Літве. Філаматы і філарэты. Жыццё і творчасць Яна Чачота. Тамаш Зан. Творчасць Адама Міцкевіча як вяршыня паэзіі польскага і беларускага рамантызму. Жыццёвы шлях паэта. Балады і паэмы Адама Міцкевіча. Санеты. «Дзяды». «Пан Тадэвуш». Адам Міцкевіч у беларускім кантэксце. Ян Баршчэўскі.

Украінская школа ў польскім рамантызме. Жыццёвы шлях і творчасць Юльюша Славацкага. Паэмы «Кардыян» і «Баладына».

Ранні расійскі рамантызм. Васілій Жукоўскі. Аляксандр Грыбаедаў.

Жыццё і творчасць Аляксандра Пушкіна. Жанры лірыкі. Раман у вершах «Яўгені Анегін». Пушкін і Беларусь.

Жыццёвы і творчы шлях Міхаіла Лермантава. Ранняя лірыка. Паэмы «Дэман» і «Мцыры». Творы перыяду першай і другой каўказскай высылкі. Раман «Герой нашага часу». Лермантаў і беларуская літаратура.

Літаратура Беларусі 1830-х – 1840-х гадоў: асноўныя тэндэнцыі развіцця. Аляксандр Ходзька. Юльян Корсак. Тадэвуш Лада-Заблоцкі. Ігнат Храпавіцкі.

Рамантычная традыцыя і нацыянальнае Адраджэнне ў літаратурах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Тарас Шаўчэнка і ўкраінская літаратура XIX ст.

Чэшскае і славацкае адраджэнне. Паэма К. Г. Махі «Май». Проза Бажэны Немцавай. Славацкія паэты-рамантыкі.

Творчыя адкрыцці позніх рамантыкаў у лірыцы. Уолт Уітмэн. Цыпрыян Каміль Норвід.

Далейшае развіццё рамантычнай плыні ў літаратуры Беларусі XIX стагоддзя. Беларускамоўныя творцы-рамантыкі. Творчасць Уладзіслава Сыракомлі. Вінцэсь Каратынскі. Ялегі Пранціш Вуль. Паўлюк Багрым. Альгерд Абуховіч. Зоф'я Манькоўская.

## Асветніцкія плыні ў літаратуры XIX стагоддзя (12 г.)

Працяг традыцый асветніцкага класіцызму ў драматургіі. Камедыі Аляксандра Фрэдра.

Асветніцкі класіцызм у беларускай літаратуры. Паэма «Энеіда навыварат» Вікенція Равінскага. Канстанцін Вераніцын і яго паэмы «Тарас на Парнасе» і «Два д'яўлы».

Далейшае развіццё беларускай сентыменталісцкай плыні. Ануфры Петрашкевіч. Адам Плуг. Адэля з Устроні. Арцём Вярыга-Дарэўскі. Вайніслаў Савіч-Заблоцкі

Творчасць Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.

Асветніцка-рэалістычныя тэндэнцыі ў беларускай літаратуры першай паловы 1860-х гг. Публіцыстычныя творы Канстанціна Каліноўскага.

## Рэалізм XIX і пачатку XX стагоддзя (88 г.)

Анарэ дэ Бальзак – «бацька» еўрапейскага рэалізму. Навела «Габсэк». Раман «Бацька Гар'ё». Мастацкія адкрыцці Гюстава Флабэра.

Рэалізм у англійскай літаратуры. Чарльз Дыкенс. Іншыя майстры англійскага рэалізму.

Станаўленне рэалізму ў расійскай літаратуры. «Натуральная школа». Мікалай Гогаль і яго раман «Мёртвыя душы». Роскві́т рэалістычнай плыні ў расійскай літаратуры другой паловы XIX стагоддзя. Творчасць Івана Тургенева. Леў Талстой. Эпапея «Вайна і мір». Позняя проза. Фёдар Дастаеўскі. Раман «Злачынства і пакаранне». Іншыя буйныя творы Дастаеўскага. Сацыяльная сатыра Салтыкова-Шчадрына. Жыццёвы , проза, драматургія Антона Чэхава. Паэзія і проза Івана Буніна.

Станаўленне літоўскай і латышскай нацыянальных літаратур. Творчасць Яніса Райніса.

Польская літаратура пазітывізму. Баляслаў Прус і яго раман «Лялька». Жыццё і творчасць Элізы Ажэшкі. Марыя Канапніцкая. Генрык Сянкевіч і яго раман «Крыжакі».

Беларуская літаратура 1870-х – 1890-х гг.: асноўныя тэндэнцыі развіцця.

Жыццё і творчасць Францішка Багушэвіча. Янка Лучына. Адам Гурыновіч. Іншыя папярэднікі «нашаніўскага» адраджэння.

Габрэйская рэалістычная літаратура ў Расійскай імперыі. Мендэле Мойхер-Сфорым і Шолам-Алейхем.

Рэалістычная драматургія ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя. Джордж Бернард Шоу. Максім Горкі.

## Дэкаданс і яго ўплывы на сусветную літаратуру (66 г.)

Крызіс традыцыйнай эстэтыкі. Імпрэсіянізм, сімвалізм, неарамантызм. Французскі і бельгійскі сімвалізм. Шарль Бадлер. Поль Верлен. Марыс Мэтэрлінк.

Скандынаўскі сімвалізм: творчасць Генрыка Ібсена.

Маладая Польшча і Станіслаў Выспяньскі

Расійскі сімвалізм: даробак Уладзіміра Салаўёва, Мікалая Мінскага, Юргіса Балтрушайціса, Канстанціна Бальмонта, Дзмітрыя Меражкоўскага, Валерыя Брусава і інш. Аляксандр Блок і яго паэма «Дванаццаць».

Акмеізм як апазіцыя расійскаму сімвалізму. Мікалай Гумілёў і «Цэх паэтаў». Ранняя творчасць Ганны Ахматавай.

Натуралізм як «дэкадансны» рэалізм.

Творчасць Лесі Украінкі.

«Наша Ніва» і літаратары-«нашаніўцы». Карусь Каганец. Ядвігін Ш. Цётка і пачаткі беларускай дзіцячай літаратуры. «Нашаніўства», беларускі дэкаданс і сімвалізм.

Асоба і творчасць Янкі Купалы. Эвалюцыя лірыкі. Купала і беларускі Космас. Паэмы ««Пошукі Купалы-драматурга. Беларусацэнтрызм як апірышча Купалавай творчасці. Купала ў савецкай Беларусі.

Якуб Колас. Месца Коласа ў прыгожым пісьменстве. Жыццёвы шлях творцы. Пачатак творчага шляху. «Песні-жальбы». Паэтычны эпас Коласа: паэмы «Новая зямля» і «Сымон-музыка». «Казкі жыцця». Трылогія «На ростанях». Колас за савецкім часам.

Жыццёвыя дарогі Максіма Багдановіча і яго месца ў беларускай літаратуры. Паэт «чыстай красы». Творчыя шуканні Багдановіча.

Асоба і творчасць Алеся Гаруна. Змітрок Бядуля: проза і паэзія.

Максім Гарэцкі: жыццё і творчасць. Дэбют у літаратуры. Творы ваеннага часу. Лірычна-аўтабіяграфічная проза.

Літаратурная палеміка ў «Нашай ніве» (1913–14 гг.).

# ПАДАГУЛЬНЕННЕ, ВЫНІКОВАЯ АТЭСТАЦЫЯ (4 г.)

## Творы для абавязковага вывучэння ў поўным аб’ёме

*Э. Т. А. Гофман*. Рыцар Глюк.

*Дж. Кітс*. Санет Касцюшку.

*Я. Чачот*. Наваградскі замак. Свіцязь.

*А. Міцкевіч*. Рамантычнасць. Люблю я. Свіцязь. Пан Тадэвуш.

*Ян Баршчэўскі*. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях.

*Э. А. По*. Крумкач.

*А. Пушкін*. Яўгені Анегін.

*М. Лермантаў*. Герой нашага часу.

*П. Багрым*. «Зайграй, зайграй, хлопча малы...»

*У. Сыракомля*. Паштар. Ілюмінацыя. Добрыя весці.

*В. Дунін-Марцінкевіч*. Ідылія. Гапон. Пінская шляхта.

*К. Вераніцын*. Тарас на Парнасе.

*А. дэ Бальзак*. Габсэк.

*М. Гогаль*. Мёртвыя душы (І том).

*І. Тургенеў*. Бацькі і дзеці.

*Ф. Дастаеўскі*. Злачынства і пакаранне.

*Л. Талстой*. Вайна і мір (т.1 і 4). Хаджы-Мурат.

*Э. Ажэшка*. Зімовым вечарам. Тадэвуш.

*М. Канапніцкая*. З узломам.

*Б. Прус*. На вакацыях. Камізэлька. Лялька.

*Г. Сянкевіч*. Крыжакі.

*Шолам-Алейхем*. Быў бы я Ротшыльдам.

*А. Чэхаў*. Чалавек у футарале. Іоныч. Дама з сабачкам. Вяртуха. Вішнёвы сад.

*М. Горкі*. Канавалаў. На дне.

*І. Бунін*. Антонаўскія яблыкі. Пан з Сан-Францыска. Лёгкае дыханне.

*Ф. Багушэвіч*. Прадмова да зб. «Дудка беларуская». Немец. Быў у чысцы. Кепска будзе!

*Янка Лучына*. Стары ляснік.

*Ядвігін Ш*. Бярозка. Падласенькі.

*А. Рэмбо*. П’яны карабель.

*С. Выспяньскі*. Вяселле.

*А. Блок*. Дванаццаць. Скіфы.

*Янка Купала*. Сон на кургане. Паўлінка. Раскіданае гняздо.

*Якуб Колас*. Новая зямля. У палескай глушы.

*М. Багдановіч*. Кніга паэзіі «Вянок». Апокрыф.

*Змітрок Бядуля*. Пяць лыжак заціркі. Бондар.

*М. Гарэцкі*. Роднае карэнне. У чым яго крыўда? Рускі. Літоўскі хутарок.

## Творы для вывучэння ва ўрыўках або на выбар выкладчыка

*Г. Гайнэ*. Вершы з «Кнігі песень».

*Дж. Г. Байран*. Паломніцтва Чайльд-Гарольда. Вершы.

*В. Жукоўскі*. Элегіі.

*А. Грыбаедаў*. Гора ад розуму.

*А. Пушкін*. Цыганы. Аповесці Белкіна. Вершы.

*М. Лермантаў*. Дэман. Мцыры. Літвінка. Вершы.

*А. Міцкевіч*. Дзяды. Гражына. Пра рамантычную паэзію. Вершы.

*Т. Зан*. Свіцязь-возера.

*Ю. Славацкі*. Баладына. Кардыян. Міндоўг, кароль літоўскі. Вершы.

*Т. Шаўчэнка*. Цары. Кацярына. Вершы.

*К. Г. Маха*. Май.

*Б. Немцава*. Бабуля.

*У. Уітмэн*. Вершы з цыкла «Лісце травы».

*Ц. К. Норвід*. Вершы з цыкла «Vademecum».

*Т. Лада-Заблоцкі*. Ваколіцы Віцебска.

*У. Сыракомля*. Хадыка. Вершы.

*В. Каратынскі*. Таміла.

*А. Абуховіч-Бандынэлі*. Мемуары.

*І. Катлярэўскі*. Энеіда.

*В. Равінскі*. Энеіда навыварат.

*Я. Чачот, Я. Баршчэўскі*. Беларускамоўныя вершы.

*А. дэ Бальзак*. Прадмова да «Чалавечай камедыі». Бацька Гарыё.

*Ч. Дыкенс*. Олівер Твіст.

*Л. Талстой*. Севастопальскія апавяданні. Вайна і мір (т. 2 і 3).

*Б. Шоу*. Пігмаліён.

*Э. Ажэшка*. Хам.

*М. Канапніцкая*. Вершы.

*К. Каліноўскі*. «Мужыцкая праўда». Лісты з-пад шыбеніцы.

«Гутарка старога дзеда».

*Шолам-Алейхем*. Станцыя Баранавічы. Тэўе-малочнік.

*Майроніс*. Вершы.

*Я. Райніс*. Агонь і Ноч. Вершы.

*Э. Ажэшка*. Хам.

*Леся Украінка*. Вершы. Лясная песня.

*М. Кацюбінскі*. Цені забытых продкаў.

*А. Купрын*. Гранатавы бранзалет.

*Ф. Багушэвіч*. Вершы.

*Янка Лучына*. Вершы. Паляўнічыя акварэлькі з Палесся.

*А. Гурыновіч*. Вершы.

*А. Ельскі*. [Прадмова да перакладу паэмы А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш»].

*Карусь Каганец*. Апавяданні. Модны шляхцюк.

*Цётка*. Вершы (у т.л. для дзяцей). Успаміны з паездкі ў Фінляндыю.

*Ш. Бадлер*. Вершы са зб. «Краскі зла».

*С. Малармэ*. Папоўдне фаўна.

*Ж. Марэас.* Сімвалізм.

*П. Верлен.* Вершы.

*М. Мэтэрлінк.* Сіняя птушка.

*Г. Ібсен.* Пер Гюнт.

*С. Пшыбышэўскі*. Снег.

*Мікалай Мінскі*. Вершы.

*В. Брусаў*. Вершы.

*Ю. Балтрушайціс.* Вершы.

*К. Бальмонт.* Элементарныя словы пра сімвалістычную паэзію. Вершы.

*А. Блок.* Вершы.

*М. Гумілёў*. Спадчына сімвалізму і акмеізм. Вершы.

*Г. Ахматава.* Вершы.

*Янка Купала.* Вершы. Адвечная песня. Чаму плача песня наша? Урыўкі з артыкулаў 1918–19 гг. (Больш самачыннасці. Беларускае войска. Незалежнасць.)

*Якуб Колас.* Сымон-музыка. Казкі жыцця. Вершы.

*М.Багдановіч*. Вершы 1913–17 гг.

*Алесь Гарун.* Вершы.

*Змітрок Бядуля.* Вершы.

*Юрка Верашчака* (*В. Ластоўскі*). Сплачвайце доўг.

*Лявон Гмырак*. Яшчэ раз аб сплачванні доўгу.

# ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧЫЯ І СУМЕЖНЫЯ ПАНЯЦЦІ, ЯКІЯ ЗАСВОЙВАЮЦЦА НА ЎЗРОЎНІ ІІІ КУРСА ЛІЦЭЯ

«аб'ектыўны стыль», «азёрная школа», акмеізм, аналітызм, артэфакт, байранізм, байранічны герой, балада, «беларускі шлях», «варшаўскі пазітывізм», верлібр (свабодны верш, гавэнда), гатычны раман, «гафманізм», гістарычны раман, дума, дэкаданс, енская школа рамантыкаў, імпрэсіянізм, натуралізм, неарамантызм, пазітывізм (у філасофіі і літаратуры), пратэізм, псіхалагічны раман, «раман выхавання», рамантызм, рамантычная іронія, рэалізм, сацыяльна-побытавы раман, сацыяльна-філасофскі раман, свабодны верш, сімвал, сімвалізм, сугестыўная паэзія, «тэатр ідэй».

# ХРЭСТАМАТЫІ І АНТАЛОГІІ, У ЯКІХ ЗМЯШЧАЮЦЦА ТЭКСТЫ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ


**Бабілёнская бібліятэка**: Замежная літаратура ў перакладах Нашай Нівы. Мн., 2007.

**Беларуская літаратура і свет**: Выбр. тэксты для чытання і аналізу. Укладанне Л.Баршчэўскага. Мн., 2006.

**Галасы з-за небакраю**: Анталогія паэзіі свету ў беларускіх перакладах XX ст. Укл. М.Скобла. Мн., 2008.

**Дрэва вечнасці:** Кніга для пазакл. чытання ў 9 класе. Укл. В. В. Кушнярэвіч. Мн., 2005.

**Заняпад і адраджэнне**: Беларуская літаратура XIX стагоддзя. Укладанне, прадм. і заўв. У.Казберука. Мн., 2001.

**Кахаць – гэта значыць**: Пераклады Рыгора Барадуліна. Мн., 1986.

**Краса і сіла**: Анталогія беларускай паэзіі XX ст. Укл. М. Скобла. Мн., 2003.

**Літаратура Беларусі XIX стагоддзя**: Анталогія. Укл. К. А. Цвірка і інш. Мн., 2013.

**Літаратура народаў свету**: Хрэстаматыя. Ч. 2. Укл. Л. П. Баршчэўскі. Мн., 1995.

**Літаратура народаў свету: XX стагоддзе**. Хрэстаматыя для 11 класа. Укл. Е. А. Лявонава, Л. П. Баршчэўскі. Мн., 1999.

**Літаратура першай паловы XIX стагоддзя**: Укладанне і камент. М. Хаўстовіча. Мн., 2012.

**Літаратура другой паловы XIX стагоддзя**: Ч. 1, 2. Укладанне і камент. Л. Г. Кісялёвай і інш. Мн., 2013.

**Маланкай жагнаныя**: Анталогія нямецкай класічнай рамантычнай паэзіі XIX стагоддзя. [Прадм. і] пераклады А. Лойкі. Слонім, 2004.

**Мае браты, мае суседзі**: Творы пісьменнікаў блізкага замежжа. Укладанне Т. Кабржыцкай і В. Рагойшы. Мн., 2008.

**Напярэймы: ад Буга да Варты.** Анталогія польскай паэзіі XX стагоддзя. Т. 1. Пераклады А. Лойкі. Мн., 2003.

**Прыйдзі, стваральны дух**: Пераклады Васіля Сёмухі. Мн., 1986.

**Раса нябёсаў на зямлі тутэйшай**: Беларуская польскамоўная паэзія XIX ст. Укладанне, прадм. і камент. У. Мархеля. Мн, 1998.

**Родная літаратура**: Хрэстаматыя для 11 класа. Укл. У. А. Дзіско, Т. М. Саўчук. Мн., 1998.

**Родная літаратура**: Хрэстаматыя для 10 класа. Укл. М. А. Лазарук і інш. Мн., 1997.

**Русская литература XIX века.** 10 класс. Хрестоматия. В 2-х частях. Сост. А. Н. Архангельский. Москва, 2005–08.

**Русская литература XX века.** 11 класс. Хрестоматия. В 2-х частях. Ч. 1. Сост. А. Леденев, Э. Безносов, В. Агеносов. Москва, 2003

**Серебряный век русской поэзии**: Хрест. для 11 кл. Сост. В. Терехина. Москва, 2003.

**Яна і я**: Вершы і песні пра каханне. Укл. Ул. Сіўчыкаў і Р. Шастак. Мн., 2005.

## ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ВЫКЛАДЧЫКАЎ

**Адам Міцкевіч і Беларусь**: Зборнік / Укл. В. Грышкевіч, рэд. А. Мальдзіс. Мн., 1997.

**Адамовіч Алесь.** Літаратура, мы і час. Мн., 1979.

**Адамовіч Антон.** Да гісторыі беларускае літаратуры / Укладанне Л. Юрэвіча. Мн., 2005.

**Адамовіч Г.** З крыніц сусветнай літаратуры: Дапаможнік. Мн., 1998 (Глава 1, Заключэнне, бібліяграфія).

**Адамовіч Г.** Літаратура – Кантэкст – Тэзаўрус. Мн., 2003.

**Адамовіч Г.** Літаратурная класіка ў параўнальным вывучэнні. Дапаможнік. Мн., 2009.

**А. С. Пушкін і Беларусь**: Зборнік / Укл. Т. Махнач; гал. рэд. А. Мальдзіс. Мн., 1999.

**Асветнікі зямлі беларускай: X – пачатак XX ст.**: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001.

**Астраух А.** Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай: Дапаможнік. Гродна, 2001.

**Багдановіч І.** Авангард і традыцыя: Беларуская паэзія на хвалі нацыянальнага адраджэння. Мн., 2001.

**Беларуская літаратура:** Вучэбны дапаможнік для 10 класа школ з профільным і паглыбленым навучаннем, ліцэяў, гімназій / Пад рэд. В. Рагойшы. Мн., 2001.

**Беларуская літаратурная класіка і сучаснасць** / Навук. рэд. В. П. Жураўлёў. Мн., 2013.

**Беларуская энцыклапедыя.** Т. 18, кн. II («Беларусь»). Мн., 2004 (раздзел «Літаратура»).

**Брунэль П., Пішуа К., Русо А.-М.** Што такое параўнальнае літаратуразнаўства? / Перакл. з франц. С. Барысевіча і А. Дынько. Мн., 1996.

**Васючэнка П.** Ад тэксту да хранатопа. Мн., 2009.

**Васючэнка П.** Беларуская літаратура XX стагоддзя і сімвалізм. Мн., 2004.

**Васючэнка П.** Драматургічная спадчына Янкі Купалы. Мн., 1994.

**Вяртання маўклівая споведзь:** Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу / Укл. Я. Янушкевіч. Мн., 1994.

**Гаранін Л.** Нацыянальная ідэя ў беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя. Мн., 1996.

**Гарэцкі М.** Гісторыя беларускае літаратуры. Мн., 1993.

**Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў**. Т. 2: Новая літаратура, другая палова XVIII–XIX ст. / Навук. рэд. У. Мархель, В. Чамярыцкі. Мн., 2007.

**Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя**. Т. 1. / НАНБ. Інстытут літаратуры імя Я. Купалы. Мн., 1999.

**Гніламёдаў У.** Ад даўніны да сучаснасці: Нарыс пра беларускую паэзію. Мн., 2001.

**Данільчык А.** «І рука твая, мне працягнутая…»: Старонкі беларуска-італьянскіх літаратурных сувязяў // Роднае слова. 2000. № 10.

**Дубянецкі Э.** Культуралогія: Энцыклапедычны даведнік. Мн., 2003.

**Дубянецкі Э.** Сусветная культура: Ад старажытнасці да нашых дзён: Папулярны энцыклапедычны даведнік. Мн., 2001.

**Жураўлёў В.** У пошуку духоўных ідэалаў: На матэрыяле беларускай літаратуры XIX – пачатку XX ст. Мн., 2000.

**І бачылі Беларусь.** *Размова з Лявонам Баршчэўскім* // Ноцунь М., Бжэзецкі А. Размовы з беларускімі інтэлектуаламі. Пер. з польск. А. Курсевіч. Гародня–Wrocław, 2009.

**Кабаковіч А.** Фальклорныя і анталагічныя традыцыі ў беларускай паэзіі. Мн., 1989.

**Кабржыцкая Т.** Дзве радзімы: Украіна і Беларусь пад міратворчымі крыламі буслоў. Мн., 2011.

**Кабржыцкая Т., Хмяльніцкі М., Дзюкава Э.** Гісторыя ўкраінскай літаратуры: Украінска-беларуска-польскія літаратурныя дыялогі. Ч. 1. Мн., 2012.

**Кісялёў Г.** Ад Чачота да Багушэвіча. Мн., 2003.

**Кісялёў Г.** Героі і музы: Гісторыка-літаратурныя нарысы. Мн.,1982.

**Кісялёў Г.** Жылі-былі класікі: Хто напісаў паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе». Мн., 2005.

**Кісялёў Г.** Сейбіты вечнага... Мн., 2009.

**Конан У.** Беларуская літаратура ў кантэксце хрысціянскіх ідэалаў // Полымя. 2000. № 2.

**Конан У.** Гісторыя эстэтычнай думкі Беларусі. Т. 1: X ст. – 1905 г. Мн., 2010.

**Конан У.** Хараство народных ідэалаў: Ля вытокаў беларускай эстэтычнай думкі // Полымя. 2000. № 9.

**Лецка К.** Вытокі і генезіс беларускага рамантызму XIX стагоддзя. Гродна, 2003.

**Лойка А.** Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд. Ч 1, 2. Мінск, 1989.

**Луцкевіч А.** Выбраныя творы: праблемы культуры, літаратуры і мастацтва. Укладанне, прадм., камент. А. Сідарэвіча. Мн., 2006.

**Лявонава Е.** «Багата загінула розных багоў…»: Асноўныя тэндэнцыі развіцця замежнай літаратуры 1-й паловы XX стагоддзя // Роднае слова. 2004. №№ 3, 4.

**Лявонава Е.** Плыні і постаці: З гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX–XX стагоддзяў. Мн., 1998.

**Мальдзіс А.** На скрыжаванні славянскіх традыцый. Мн.,1980.

**Мальдзіс А.** Падарожжа ў XIX стагоддзе. Мн., 1969.

**Малюковіч С.** «Блакітную кветку шукаю…»: Рамантычная лірыка паэтаў Германіі // Роднае слова. 1999. № 7.

**Малюковіч С.** «Гармоніяй гукаў хачу я упіцца…»: Лірыка паэтаў Англіі XIX ст. // Роднае слова. 1999. № 2.

**Малюковіч С.** «Зорка вечару ясная»: Лірыка паэтаў Францыі // Роднае слова. 2000. №№ 3, 5, 6.

**Малюковіч С.** Рамантызм // Роднае слова. 1998. №№ 3, 5.

**Малюковіч С.** У палоне журбы: Паэзія Эдгара По і амерыканскі рамантызм // Роднае слова. 2003. №№ 5, 6.

**Мархель У.** Прадвесце: Беларуска-польскае літаратурнае ўзаемадзеянне ў першай палавіне XIX ст. Мн., 1991.

**Мархель У.** Прысутнасць былога : Нарысы, артыкулы, эсэ. Мн., 1997.

**Мархель У.** Шлях да Беларусі: Адам Міцкевіч – прадвеснік адраджэння беларускай літаратуры. 2-е выд. Мн., 2003.

**Мастацтва:** Навуковы дапаможнік для 10 класа агульнаадукацыйнай школы / Аўт.-укл. Г. Наполава. Мн., 1998.

**Нарысы беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязей** / Рэд. М. Тычына, У. Мархель. Мн., 2002.

**Нарысы па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей** / Гал. рэд. В. Каваленка. Т. 1–4. Мн., 1993–1995.

**Пачынальнікі:** З гісторыка-літаратурных матэрыялаў XIX ст. / Укл. Г. Кісялёва. Мн., 2003.

**Рагойша В.** Тэорыя літаратуры ў тэрмінах. Мн., 2001.

**Рагойша В.** Па дарозе да Парнаса: Даведнік маладога літаратара. Мн., 2003.

**Рагойша В. П., Кенька М. П., Марозава Т. А.** Уводзіны ў літаратуразнаўства. У дзвюх частках. Мн., 2011–12.

**Рагуля А.** Зерне хараства: Культурфіласофскія нататкі. Мн., 2013.

**Савік Л.** Пакліканыя. Літаратура беларускага замежжа. Мн., 2001.

**Садаўнічы Э.** Рамантызм у кантэксце гісторыі сусветнай літаратуры // Роднае слова. 2001. №№ 7, 9, 10, 12.

**Сінькова Л.** Паміж тэкстам і дыскурсам: беларуская літаратура XX–XXI ст. Мн., 2013.

**Склют Р.** Мастацкая крыптаграфія ў нашай літаратуры // Спадчына. 1997. № 1.

**Славутыя імёны Бацькаўшчыны:** Зборнік. Вып. 1, 2 / Гал. рэд. А. Грыцкевіч. Мн., 2000, 2003.

**Спанкэрэн К. Ван.** Нарыс аб амерыканскай літаратуры / Перакл. В. і Л. Калабан. Інфармацыйнае агенцтва Злучаных Штатаў, [б. г.]

**Станкевіч Ст.** Беларускія элементы ў польскай рамантычнай паэзіі. Вільня – Беласток, 2010.

**Тарасюк Л.** Апалогія красы: Кніга пра беларускую паэзію. Мн., 2003.

**Тарасюк Л.** Імпрэсіянізм у беларускай літаратуры // Роднае слова. 2001. № 4.

**Тарасюк Л.** Рамантызм у беларускай літаратуры // Роднае слова. 1998. №№ 9, 10.

**Тычко Г.** Беларуская літаратура XIX–XX стагоддзяў: час і асобы. Мн., 2010.

**Тычко Г.** Творчасць Янкі Купалы і традыцыі духоўнай рэгіянальнасці ў польскай літаратуры XIX – пачатку XX ст. Мн., 2001.

**Тычына М.** Аляксандр Пушкін і Якуб Колас. Мн., 1999.

**Тычына М.** Карані і крона: Фальклор і літаратура. Мн., 2002.

**Тычына М.** Янка Купала і Якуб Колас: учора і сёння. Мн., 2012.

**Хаўстовіч М.** Гісторыя беларускай літаратуры 30–40-х гг. XIX ст. Мн., 2001.

**Хаўстовіч М.** Шляхамі да беларускасці: Нарысы, артыкулы, эсэ. Варшава, 2010.

**Цвірка К.** Камяні тых сядзібаў: Шляхі паэтаў XIX ст. Мн., 2004.

**Цвірка К.** Лісце забытых алеяў: Эсэ. Мн., 1993.

**Шаладонава, Ж. С.** Духоўныя спектры агню: Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура пачатку XX ст. Мн., 2009.

**Штэйнер І.** Варожаць балады вякоў. Мн., 1993.

**Штэйнер І.** Шматмоўная літаратура Беларусі XIX стагоддзя. Мн., 2002.

**Яцухна В.** Тэорыя літаратуры. Гомель, 2006.

# АЎТАРСКАЯ ПРАГРАМА

вывучэння курса

# Мастацтва XX стагоддзя

*у гуманітарным ліцэі*
*з беларускай мовай навучання*


Склалі:
*Сурскі Ягор,*
магістр гісторыі
*Лявон Баршчэўскі,*
кандыдат філалагічных навук

# УСТУП

## Сусветнае мастацтва як дысцыпліна ў гуманітарным ліцэі

### *Да гісторыі пытання*

Неабходнасць распрацоўкі асобнага курсу «Сусветнай мастацкай культуры» у межах сярэдняй школы з'явілася з моманту набыцця незалежнасці нашай краіны, што адпавядала мэтам набліжэння сусветнага кантэксту культуры, калі ў савецкія часы ў розных культурных сферах збольшага ажыццяўлялася вывучэнне кантэксту рускай культуры як у выяўленчым мастацтве, так і літаратуры, музыцы, архітэктуры. Азнаямленне з творамі сусветнай культуры адбывалася таксама пры пасярэдніцтве цэнтра, калі амаль усе буйныя выстаўкі, мерапрыемствы міжнароднага значэння адбываліся ў Маскве. Даволі красамоўным з'яўляецца, напрыклад, і той факт, што Марк Шагал падчас свайго адзінага прыезду ў Савецкі Саюз пасля эміграцыі ў 1973 г., мог наведаць толькі Маскву і Ленінград, пры тым што амаль праз усё жыццё ў яго творчасці праходзіў «віцебскі матыў» роднага горада. З іншага боку савецкія мастакі плакату для ўдзелу ў міжнародных конкурсах вымушаны былі зацвярджаць свае працы праз адмысловую камісію ў Маскве, а не адпраўляць наўпрост у Варшаву, Брно, Лахці. Такіх прыкладаў можа быць прыведзена яшчэ больш, манапалізацыя культурных дачыненняў у Савецкім Саюзе была відавочная. Як вынік гэтага адчуваўся значны недахоп у

веданні сусветных культурных працэсаў. Зразумела, што кожная краіна мае сваю спецыфіку міжнародных дачыненняў у галіне культуры, гуманітарных ведаў. За часы, як нашая краіна стала незалежнай у 1991 годзе, навукоўцамі, грамадскімі дзеячамі шмат было зроблена ў рэчышчы як аднаўлення культурных сувязяў з іншымі краінамі так і аднаўлення памяці аб беларускіх культурніцкіх дачыненнях і бясспрэчных дасягненнях у агульнаеўрапейскім кантэксце.

У Беларускім гуманітарным ліцэі аўтарскія праграмы па гуманітарных дысцыплінах пачалі распрацоўвацца выкладчыкамі з моманту заснавання адукацыйнай установы. Аўтарамі гэтых праграм былі кандыдаты мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава, Вячаслаў Ракіцкі, Аляксей Хадыка, Яўген, Шунейка, Ларыса Зайцава. На працягу многіх год ажыццяўлялася практыка выкладання інтэграванай дысцыпліны «Літаратура і сусветная мастацкая культура».

Веды па сусветнай мастацкай культуры з’яўляюцца важным складнікам агульнай гуманітарнай адукацыі і адпавядаюць прынцыпам усебаковага развіцця асобы. Але ў 2008 годзе прадмет «Сусветная і айчынная мастацкая культура» быў зусім выключаны з вучэбных праграм агульнаадукацыйных школ Беларусі. У сітуацыі агульнай моўнай прасторы з Расіяй, калі Беларусь разглядаецца як прыдатак расейскамоўнай культурнай індустрыі, напрыклад, у міжнародным кінапракаце ці папулярнай эстраднай культуры, пад пытанне ставіцца як культурная аўтаномія нашай краіны, так і наўпроставы характар культурных дачыненняў з іншымі краінамі. Сітуацыя значнай залежнасці ад культурнай сферы суседняй краіны спрыяе культурнай ізаляцыі, абмежаванасці ўключэння і інтэграванасці ў сусветны культурны працэс.

Досвед мастацтва ХХ стагоддзя непасрэдна звязаны з такімі трансфармацыйнымі з’явамі ў культуры як новая музеялогія, што ахоплівае значны грамадзянскі кантэкст і па-новаму рэ-

прэзентуе гістарычную карціну свету, таму здольнасць успрымаць сучасную культуру наўпрост звязана з гісторыяй мастацтва нядаўніх часоў. Асобнае вывучэнне мастацтва XX стагоддзя адлюстроўвае неабходнасць станаўлення інстытуту сучаснага мастацтва як грамадскай з’явы. Апошнія захады ў сістэме сярэдняй адукацыі пазбаўляюць магчымасці падлеткам атрымліваць веды, якія дапамогуць арыентавацца ў сучасным культурным жыцці еўрапейскай і сусветнай прасторы.

Курс «Мастацтва XX стагоддзя» заснаваны на вывучэнні мастацтва ў еўрапейскім і сусветным кантэксце, улічвае адпаведны досвед выкладання сусветнай мастацкай культуры ў Польшчы, іншых еўрапейскіх краінах.

Патрэба распрацоўкі асобнай дысцыпліны «Мастацтва XX стагоддзя» звязана яшчэ і з тым, што адпаведнага вывучэння і аналізу патрабуюць мастацкія працэсы, звязаныя з альтэрнатыўнай інтэрпрэтацыяй мастацтва і гісторыка-культурнай спадчыны эпохі таталітарызму. Дадатковай падрыхтоўкі патрабуе вучань, каб арыентавацца ў культурных з’явах сучаснасці, якія адлюстроўваюць прынцыпы філасофска-культурніцкай фармацыі постмадэрнізму. Таксама выкладанне сучасных культурных працэсаў патрабуе засяроджанасці на з’явах сумежных сфераў культуры а таксама сінтэзу мастацтва, што шырока праяўляецца ў сучасным мастацтве, дызайне, тэатры, музыцы.

Курс «Мастацтва XX стагоддзя» таксама разлічаны і на арыентацыю вучняў у асноўных прынцыпах і навыках працы сучаснага аніматара культуры (арт-мэнэджара), што можа азначаць практычны характар прымянення атрыманых ведаў у сувязі з магчымым выбарам адпаведнай прафесіі.

# МЕТАДЫЧНАЯ НАТАТКА

Дысцыпліна «Мастацтва ХХ стагоддзя» у гуманітарным ліцэі арыентаваная на стварэнне для навучэнцаў магчымасцяў развіцця ўменняў і навыкаў, набытых імі на папярэднім этапе навучання з іншых дысцыплін ведаў (літаратура, гісторыя). Курс «Мастацтва ХХ стагоддзя» ў гуманітарным ліцэі скіраваны на спасціжэнне рэчаіснасці праз мастацкія творы, помнікі архітэктуры, візуальную рэчаіснасць у яе эстэтычным вымярэнні. Акрамя традыцыйных формаў урока або лекцыі павінны шырока практыкавацца семінары, дыспуты. У суме метады навучання так ці інакш павінны спрыяць выяўленню самых розных функцый мастацтва: эстэтычнай, выхаваўчай, духоўнай, аксіялагічнай. Агульным патрабаваннем для ўсіх метадаў навучання ёсць яго арыентацыя на спасціжэнне сучасных культурных працэсаў зыходзячы з багатага досведу мастацтва ХХ стагоддзя. Пры гэтым творчае засвойванне курса «Мастацтва ХХ стагоддзя» павінна спрыяць як мага больш поўнай рэалізацыі задач грамадзянскага і патрыятычнага выхавання, крытычнага ўспрыняцця з'яў рэчаіснасці.

### *Патрабаванні да ўменняў і навыкаў навучэнцаў на этапе IV года навучання ў ліцэі*

I. Успрыманне візуальных артэфактаў і разуменне іх зместу і стылістычнай прыналежнасці.

*Навучэнец павінен*: успрымаць візуальныя артэфакты культуры (творы выяўленчага мастацтва, архітэктуры, скульптуры); выяўляць сэнс, закладзены ў творы мастацтва; рас-

пазнаваць асаблівасці мастацкага твору і умець вызначыць яго стылістычную прыналежнасць, грунтуючыся на ведах па гісторыі мастацтва XX стагоддзя.

II. Аналіз і інтэрпрэтацыя твораў мастацтва ў гістарычным і аксіялагічным вымярэнні.

Навучэнец ужывае ў сваім аналізе найважнейшыя паняцці аналізу твора мастацтва; у інтэрпрэтацыі выкарыстоўвае веды з гісторыі, вызначаючы нацыянальны складнік твору мастацтва, а таксама яго міжнародную стылістычную перадумову з'яўлення і бытавання на пэўнай тэрыторыі, на якой дадзены твор мастацтва можа быць успрыняты; разбіраецца ў неабходных для спасціжэння фактах з гісторыі і іншых галін гуманістыкі; умее вылучыць розныя аксіялагічныя значэнні твора; здольны рабіць параўнаўчы аналіз твораў у кантэксце адпаведных стылістычных напрамкаў.

### *Асаблівасці вывучэння мастацтва XX стагоддзя на IV годзе навучання ў ліцэі*

На старэйшых курсах ліцэя навучэнец уваходзіць у стадыю дарослага жыцця: гэта час эмацыйнага і інтэлектуальнага даспявання яго асобы. Самастойныя рашэнні і дзеянні робяцца галоўнай рысай жыццёвай пазіцыі маладога чалавека, якую ён гатовы бараніць як незалежнасць сваёй асобы. У гэты час навучэнец, як правіла, робіцца свядомым спажыўцом культуры, набывае здольнасці сінтэзавання і сістэматызавання з'яў, звязаных з моўна-культурнымі традыцыямі свайго народа і навакольнай рэчаіснасцю. Чытанне літаратурных тэкстаў дазваляе яму фармуляваць жыццёва важныя пытанні і шукаць адказы на іх.

У гэтай сітуацыі роля выкладчыка палягае на разумным і далікатным кіраванні, стымуляванні самастойнага развіцця асобы навучэнца, матываванні яго да ўдумлівага падыходу ва ўспрыманні твораў мастацтва. Варта асабліва адзначыць, што на гэтым этапе свайго жыцця навучэнцы асабліва ўразлівыя што да пытання сваёй суб'ектнасці. Пры асабліва яскрава выяўленым крытычным стаўленні да навакольнага свету ў асобе маладога чалавека адначасова развіваюцца рысы талерантнасці да «іншасці». Задачай педагога ў такой сітуацыі ёсць стымуляванне такіх працэсаў, цярплівае і ненавязлівае прышчапленне навучэнцам умення паважаць іншыя думкі і іншы светапогляд.

Выкладчык павінен увесь час дбаць пра тое, што раней набытыя веды з гісторыі, літаратуры і мастацтва, уменні і навыкі павінны знаходзіць не гэтулькі колькаснае, колькі якаснае развіццё. Гэты вельмі істотны элемент дачыненняў паміж рознымі этапамі навучання павінен адыгрываць найважнейшую ролю ў кантэксце абмеркавання на занятках па мастацтву XX стагоддзя канкрэтных твораў.

Вывучэнне літаратуры на трэцім курсе ліцэя мае на мэце, у т. л. фармаванне ў навучэнцаў навыкаў гістарычна-параўнальнага аналізу. Навучэнец павінен беспамылкова ўмець вызначаць прыналежнасць твораў мастацтва да адпаведнай стылістычнай плыні.

Іншым, магчыма яшчэ больш важным, кампанентам адукацыі ў межах курсу «Мастацтва XX стагоддзя» можа быць развіццё ў маладых людзей навыкаў мыслення ў аспекце праблемнага падыходу. Выкладчык павінен стымуляваць выказванне навучэнцамі альтэрнатыўных – у параўнанні са сфармуляванымі ў навучальных дапаможніках – думак. Адзінай умовай пры гэтым павінна быць імкненне знаходжання як мага больш пераканаўчых аргументаў на карысць сваёй думкі.

Галоўнай мэтай адукацыі на заключным этапе навучання ў ліцэі павінна быць фармаванне ў маладых людзей навыкаў і ўменняў свядомага ўспрымання твораў мастацтва і гісторыка-культурнай спадчыны азначанага перыяду. Навучэнец павінен стаць свядомым карыстальнікам культурнай спадчыны ў яе гістарычным прыбліжэнні, улічваючы мастацкія і культурныя працэсы нядаўняга часу.

Менавіта аналіз і інтэрпрэтацыя ствараюць аснову, на якой грунтуецца засваенне праграмы па мастацтве XX стагоддзя ў ліцэі.

Навучэнцы ў працэсе аналізу і інтэрпрэтацыі канкрэтных твораў мастацтва засвойваюць найважнейшыя мастацтвазнаўчыя паняцці, уласцівыя гісторыі мастацтва XX стагоддзя: стыль, абстракцыя, авангардызм, кампазіцыя, мастацкі напрамак, акадэмізм, алегорыя, андэрграўнд, артэфакт, дэкаратыўнае мастацтва, канцэптуальнае мастацтва, манументальнасць, фігуратыўнае мастацтва і інш.

Радыкальныя змены ў інфарматыўна-камунікатыўнай прасторы, якія адбываюцца ва ўсім свеце ў апошнія дзесяцігоддзі, адным са сваіх адмоўных вынікаў маюць істотнае зніжэнне інтарэсу моладзі да твораў мастацтва, што патрабуюць напружанай мыслядзейнасці і асаблівага эмацыйнага настрою дзеля іх адэкватнага ўспрымання. Таму надзвычай важным уяўляецца надаванне асаблівай увагі вырашэнню задачы фармавання ў ліцэістаў *навыкаў і ўменняў*, а ў першую чаргу наступных:

– уменняў і навыкаў, звязаных з эстэтычным успрыманнем твора мастацтва або яго фрагмента;
– аналітычных уменняў і навыкаў;
– сінтэзавальных уменняў і навыкаў (здольнасць супастаўляць, абагульняць, рабіць высновы);
– уменняў і навыкаў, звязаных з асабістай ацэнкай мастацкага твора.

# ЗМЕСТ ВЫВУЧЭННЯ КУРСА

## IV год навучання (35 гадзін)

**Уводзіны** (1 г.). Канец XIX і пачатак XX стагоддзя – пераломная эпоха ў гісторыі мастацтва Еўропы і Паўночнай Амерыкі.

**Мастацтва авангарду пачатку XX стагоддзя (2 г.)***

Экзістэнцыйны непакой у творчасці Э. Мунка, В. ван Гога.

Адыход ад рэлізму ў жывапісе.

Творчасць К. Монэ, А. Рэнуара, П. Сіньяка, Ж. Сэро.

Фавізм.

Творчасць А. Матыса, Ж. Руо, А. Дэрэна, М. дэ Вламінка.

Экспрэсіянізм.

Суполкі «Мост», «Сіні коннік».

Творчасць Э. Кірхнера, Ф. Блэйля, Э. Хэкеля, К. Шміта-Ротлуфа.

Творчасць В. Кандзінскага, О. Какошкі, П. Клее, Эміля Нольдэ, О. Дыкса, Х. Суціна, М. Шагала, А. Мадыльяні.

Экспрэсіянізм у кіно і архітэктуры.

**Трыумф авангарду (3 г.)**

Кубізм.

Творчасць П. Пікаса, Ж. Брака, Х. Грыса, Р. Дэланэ, Ж. Мэцынгера,Ф. Лежэ.

Футурызм.

Творчасць Ф. Т. Марынэці, У. Бачоні, К. Кара, Дж. Бала, Л. Русала, Дж. Севярыні.

---

* Колькасць гадзін на праходжанне той ці іншай тэме можа змяняцца выкладчыкам.

Творчасць М. Ларыонава, Н. Ганчаровай.

Супрэматызм і канструктывізм.

Творчасць К. Малевіча, Эль Ліціцкага.

Пачатак канцэптуальнага мастацтва.

Творчасць Ф. Стэлы, У. Татліна, А. Родчанкі.

Дадаізм.

Творчасць М. Дюшана, М. Рэя.

Мастацтва правакацыі.

Часопіс «Дэ штыль», Баўхаўс.

Сюрэалізм.

Творчасць А. Брэтона, М. Эрнста, С. Далі, Х. Міро, Р. Магрыта, Дж. дэ Кірыка.

**Музычная культура XX стагоддзя** (4 г.)

Багацце стылёвых напрамкаў у сучаснай музыцы.

Класічная музыка ў XX ст. (Р. Вагнер: развіццё ідэй).

Канец эпохі: позні рамантызм канца XIX – пачатку XX ст.

Аўстрыя і Германія (Г. Малер, Р. Штраўс)

Францыя (К. Сэн-Санс, Г. Фарэ, Ж. Маснэ).

Іспанія (М. дэ Фалья).

Скандынавія (Я. Сібеліус).

Англія (Э. Элгар, Р. В. Уільямс).

ЗША (Д. Г. Мэйсан).

Расія (М.Рымскі-Корсакаў, С. Рахманінаў, А. Скрабін, С. Пракоф'еў).

Новыя шляхі: музычныя плыні на мяжы стагоддзяў.

Музычны імпрэсіянізм (К. Дэбюсі).

Стыль мадэрн у музыцы (М. Равэль).

Музычны экспрэсіянізм (Р. Штраўс, раннія А. Шонберг і А. Берг).

Верызм у музыцы (П. Масканы, Р. Леанкавала, Дж. Пучыні).

Музычны фалькларызм (І. Стравінскі, Б. Бартак, Б. Марціну, Дж. Гершвін).

Па-за стылем (Ч. Айвз, Э. Саці).

Авангард у Францыі (Саці, Ф. Пуленк, А. Анегер).

Амерыканскія эксперыменты ў музыцы (Г. Коўэл, Ч. Сігер).

Неакласіцызм у музыцы Францыі, Германіі, Італіі і Амерыкі (Шонберг, А. Веберн, Берг, Анегер, Пуленк, П. Хіндэміт, К. Орф, Э. Віла-Лобас, А. Коўпланд).

Музычны серыялізм (П. Булез, К. Штокхаўзен, В. Лютаслаўскі).

Музычная алеаторыка (Дж. Кейдж).

Электронная музыка (П. Анры).

Пасляваенны музычны авангард 40-х – 60-х гг. Ідэі Т. Адорна.

Мінімалізм у музычнай культуры (Ф. Глас).

Постмадэрнізм музычнай культуры (Л. Бер'ё, Дж. Освальд).

Музыка ў кіно.Выбітныя беларускія кампазітары ХХ ст. (Я. Тарасевіч, М. Равенскі, М. Шчаглоў-Куліковіч, М. Крошнер, Г. Вагнер, Я. Цікоцкі, А. Туранкоў, Я. Глебаў, І. Лучанок, В. Капыцька, У. Солтан і інш.).

Джаз, рок'н-рол, іншыя «некласічныя стылі» музыкі.

**Тэатральнае мастацтва ў ХХ ст.** (3 г.)

Тэатральная культура пачатку ХХ ст.

Рэжысура ў тэатры МХАТ (К. Станіслаўскі, У. Немировіч-Данчанка). «Сістэма Станіслаўскага».

Эвалюцыя творчасці У. Меерхольда.

Тэатр парадоксаў Б. Шоу.

Новыя драмы А. Стрындберга.

Тэатральныя адкрыцці Ю. О'Ніла.

Эпічны тэатр Б. Брэхта.

Тэатр абсурду.

«Бедны тэатр» Е.Гратоўскага.

Эксперыменты ў маскоўскім тэатры на Таганцы.

Знакавыя постаці беларускага тэатра (І. Буйніцкі, Ф. Жда-

новіч, Ф. Аляхновіч, Е. Міровіч, Б. Платонаў, С. Станюта, Г. Макарава, Г. Гарбук і інш.).

Дакументальны тэатр і дакументальная драма.

**Кіно – мастацтва XX стагоддзя** (5 г.).

Узнікненне кінематографа.

Нямое кіно.

Кінамастацтва экспрэсіянізму.

Галівуд і яго дасягненні.

Камернае і масавае кіно.

Новы рэалізм у кінематографе.

Кіно андэрграўнда.

Пошукі новых формаў выразнасці ў сучасным кіно.

Беларускае кіно: дасягненні і страты (Ю. Тарыч, У. Корш-Саблін, В. Тураў, В. Рыбараў, М. Пташук, У. Кудзіненка і інш.).

**Міжваенны перыяд у выяўленчым мастацтве** (2 г.)

Вяртанне да рэалізму.

Творчасць П. Коха, А. К. Вілінка, П. Дэльво, К. Пэрмеке, Г. дэ Шмэта, В. Робертса, С. Спенсера.

Мастацтва мексіканскіх мурале.

Творчасць Х. К. Ароска, Д. Рыв’еры.

Сюррэалізм Бальтуса.

Мастацтва метафізічнае, «Новэчэнта», другі рэалізм.

Мастацтва Дж. Марандзі, М. Сіроні, Ф. Дэпера.

Кола выставы «Новая рэчаіснасць».

Творчасць К. Шада, О. Дыкса, Г. Гроша.

Ар дэко.

Прэцыянізм у ЗША.

Пачатак мадэрнізму ў архітэктуры.

Архітэктура А. Лооса, В. Гропіуса, Ле Карбюзье, М. ван дэн Роэ.

**Выяўленчае мастацтва другой паловы XX стагоддзя** (3 г.)

Новая фігуратыўнасць у Англіі.

Група «КОБРА».

Творчасць Ф. Бэкана, Л. Фройда, П. Алехінскага, П. Карнэля, А. Ёрна, К. Апэля.

Фігуратыўная скульптура (А. Джакамэці).

Неарэалізм і абстракцыянізм у Італіі.

Творчасць А. Піцыната, Р. Гутуза, групы «Форма 1», «Рух канкрэтнага мастацтва».

Мастацтва акцыянізму.

Творчасць Дж. Полака.

Ташызм.

Нефармальны жывапіс, скульптура, спац'ялізм.

Творчасць Ж. Фатрыера, Ж. Дубуфэта, А. Буры, Л. Фантаны.

**Новы авангард** (3 г.)

Неададаізм, Новы рэалізм, Поп-арт.

Творчасць Д. Споры, Э. Уорхала, Р. Ліхтэнштэйна, К. Олдэнбурга.

Англійскі, італьянскі поп-арт.

Творчасць Р. Хамільтана, А. Джонса, Т. Фэсты, М. Шыфана, Д. Гнолі.

Кінетычнае мастацтва і оп-арт.

Групы «Т» (Мілан), «Н» (Падуя), «Зэро» (Дзюсельдорф).

Творчасць Л. Мохай-Надзь, Ж. Тынглі.

Мастацтва хэпінінгу.

Творчасць А. Карпава, Дж. Кэйджа, Ё. Бойса.

Мастацтва «бодзі-арт».

Канцэптуальнае мастацтва. Італьянскі дызайн 60–70 гг. Візуальная паэзія.

Мінімалізм.

Архітэктанічныя утопіі.
Беднае мастацтва, лэнд-арт.

**Постмадэрнізм у выяўленчым мастацтве канца XX стагоддзя** (2 г.)

Мастацтва графіці.
Творчасць К. Харынга, Р. Кутронэ.
Неаэкспрэсіянізм.
Тэатр танца П. Баўш.
Трансавангард.
Анахранізм.
Скульптуры І. Міторая.
Відэа-арт. Нэм Джун Пайк.
Мультымедыйнае мастацтва.
Архітэктура хай-тэк.

**Мастацтва пачатку XXI стагоддзя і яго узаемадачыненні з іншымі сферамі** (2 г.)

Сінтэтычнае развіццё мастацтва.
Мастацтва і мода.
Мастацтва і рэклама.
Архітэктура і прамысловы дызайн.
Плакатнае мастацтва.
Дэканструктывізм.
Кіч.
Сучасная крытыка постмадэрнізму.

**Асновы арт-мэнэджмэнту** (3 г.)

Арт-мэнэджмэнт як адзін з элементаў навукі аб арганізацыі (мэнэджмэнту).

Умовы развіцця культуніцкай сферы.

Арт-мэнэджмэнт як асобная навуковая дысцыпліна.

Асаблівасці культурніцкага прадукту.

Арт-мэнэджмэнт і эканамічны і творчы спосаб мыслення.

Арт-мэнэджмэнт як від дзейнасці па фарміраванню культурнага асяроддзя і спажыўцоў культуры.

**Падагульненне, выніковая атэстацыя** (2 г.)

## ТВОРЫ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА ДЛЯ АБАВЯЗКОВАГА ВЫВУЧЭННЯ І АНАЛІЗУ

*Э. Мунк «Крык»*
*В. ван Гог «Пакой мастака ў Арлі»*
*А. Маціс «Радасць жыцця»*
*Э. Мэндэльсон «Вежа Эйнштэйна»*
*Х. Суцін «Ялавічная туша»*
*М. Шагал «Партрэт яўрэя на ружовым фоне»*
*П. Пікаса «Авіньёнскія дзяўчаты»*
*П. Пікаса «Герніка»*
*Дж. Бала «Дынамізм сабакі на павадку»*
*У. Бачоні «Атака улан»*
*К. Малевіч «Чорны квадрат»*
*Дж. Полак «Адно»*
*М. Дзюшан «Фантан»*
*Р. Магрыт «Спроба немагчымага»*
*С. Далі «Пастаянства памяці»*
*Р. Гутуза «Захоп пустуючых зямель у Сіцыліі»*
*Э. Уорхал «200 бляшанак супу»*
*Э. Уорхал «Мэрылін»*
*У. Татлін «Помнік III Інтэрнацыяналу»*
*У. ван Ален «Будынак Крайслера»*
*Ф. Лойд Райт «Будынак Каўфмана»*
*Ё. Утцон «Будынак оперы»*

*Ле Карбюзье «Капліца Нотр-Дам-дзю-О»*
*М. Ротка «Зямля і зелень»*
*І. Міторай «Цэнтурыён І»*

**ЗАЎВАГА:** Музычныя творы для праслухоўвання, фільмы для прагляду вучнямі прапануюцца выкладчыкам.

## МАСТАЦТВАЗНАЎЧЫЯ І СУМЕЖНЫЯ ПАНЯЦЦІ, ЯКІЯ ЗАСВОЙВАЮЦЦА НА ЎЗРОЎНІ IV КУРСА ЛІЦЭЯ

аналітызм, артэфакт, дадэкафонія, джаз, імпрэсіянізм, сімвал, абстрактнае мастацтва, авангардызм, агітацыйнае мастацтва, акадэмізм, аналітычнае мастацтва, артэфакт, бодзі-арт, дэкаратыўнае мастацтва, дызайн, інтэрнацыянальны стыль, канструктывізм, кінэтычнае мастацтва, лэнд-арт, мадэрнізм, манументальнасць, мінімалізм, новы класіцызм, новы рэалізм, постмадэрнізм, сістэма Станіслаўскага, стыль мадэрн, супрэматызм, фігуратыўнае мастацтва, хэпенінг.

## ВЫКАРЫСТАНАЯ ЛІТАРАТУРА

**Баженова Л. М., Некрасова Л. М., Курчан Н. Н., Рубинштейн И. Б.** Мировая художественная культура. XX век. Кино, театр, музыка. СПб., 2009.
**Беларуская энцыклапедыя**. Т. 18, кн. 2. Мн., 2004.
**Билеты:** Мировая художественная культура. 11 кл. Мн., 2002.
**Доля беларускае культуры пад саветамі 1920–1991 гг.:** А. Е. Тарас (укладальнік). Мн., 2012.
**Дубянецкі Э. С. Сусветная культура**: Энцыкл. даведнік. Мн., 2001.
**Дубянецкі Э. С. Культуралогія:** Энцыкл. даведнік. Мн., 2003.
**Захарына Ю. Ю., Зелянеўская С. М.** Сусветная мастацкая культура. Ч. 2, Ад Адраджэння да пачатку XXI ст. Мн., 2011.

**Парашкоў С. А.** Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 2003.
**Таталітарызм. Курс лекцыяў:** Анціпенка А. І. (складальнік). Мн., 2007.
**Терминологический словарь «Аполлон»**: Под общ. ред.А. М. Кантор. М., 1997.
**Художественная культура. XVIII – начало XXI века:** Лебедев С. Ю. (автор-составитель). Мн., 2007.
**Хурсан Л. И., Гайдуль В. Е.** Свет сквозь столетия. Мировая художественная культура: 10 кл. Мн., 2001.
**Чепайтене Р.** Культурное наследие в глобальном мире. Вильнюс, 2010.
**Энцыклапелыя літаратуры і мастацтва Беларусі**: Т. 1–5. Мн., 1984–87.

**ANGLANI, Marcela; MARTINI, Maria Vittoria; PRINCI, Eliana; VETTESE, Angela.** Sztuka współczesna. Warszawa, 2012.
**CRAGOE, Carol Davidson.** Jak czytać architekturę. Warszawa, 2010.
**FERRARI, Silvia.** Sztuka XX wieku. Warszawa, 2002.
**FRIDE, Patricia; CARRASSAT, R.; MARCADE, Isabelle.** Style i kierunki w malarstwie. Warszawa, 1999.

# ЗМЕСТ

Уступ........................................................................................ 3

Аўтарская праграма вывучэння курса
«Гісторыя Беларусі ад старажытнасці
да канца XVIII ст.»........................................................................ 5
Аўтарская праграма вывучэння курса
«Літаратура ад рамантызму да сімвалізму
і нашаніўскага адраджэння»...................................................... 31
Аўтарская праграма вывучэння курса
«Мастацтва XX стагоддзя»........................................................ 57

**Гісторыя** Беларусі. Літаратура. Сусветнае мастацтва : эксперы-
Г51 ментальныя аўтарскія праграмы гуманітарнага ліцэя / Складальнікі: Валянцін Голубеў і інш. — Мінск : Рэспубліканскае грамадскае аб’яднанне «Таварыства беларускай школы», 2014. — 74 с.

Зборнік аб’ядноўвае эксперыментальныя навучальныя праграмы курсаў па гісторыі Беларусі, літаратуры і сусветным мастацтве для гуманітарнага ліцэя, складзеныя іх аўтарамі і выкладчыкамі.

Рэкамендуецца педагогам сярэніх навучальных устаноў гуманітарнага профілю.

**ББК 74.26**
**УДК 37.01**